Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 МАЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 93 (27703) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Сёння вызначацца паўфіналісты хакейнага чэмпіянату

СТАР. 3

Сямейная газета



## Традыцыя шматдзетнасці

### ЛІЧБА ДНЯ

## Да Br5 млн

*зможа зарабіць сёлета падлетак у лагеры адпачынку і працы. Пра гэта паведаміла начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна Рысявец. Усяго ў Мінску будуць працаваць каля 50 лагераў працы і адпачынку, прычым 8 з іх адкрыюцца на базе загарадных лагераў. Плануецца, што частку сваіх канікул у складзе такіх працоўных аб'яднанняў правядуць больш за 1,5 тыс. дзяцей. Пералік відаў работ, якія могуць выконваць непаўналетнія, дакладна вызначаны пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У асноўным гэта работы па добраўпарадкаванні, азеляненні і прыбіранні тэрыторый, сартаванні садавіны, аграработы (прапалка, збор ягад, садавіны).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10040,00 | ■ |
| Еўра | 13770,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 291,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 834,93 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Профі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Пасля заканчэння Салігорскага прафесійна-тэхнічнага каледжа Вадзім Лазнік (на фота) працуе тынкоўшчыкам на мантажна-будаўнічых пляцоўках горада шахцёраў. Удзел у Першым нацыянальным чэмпіянаце прафесійнага майстэрства «WorldSkills Belarus — 2014» для маладога спецыяліста важная падзея ў жыцці.*

# ПРАЦАВАЦЬ ГАЛАВОЙ, СЭРЦАМ І... РУКАМІ!

## Першы нацыянальны чэмпіянат прафмайстэрства «WorldSkills Belarus – 2014» было вырашана зрабіць святам прафесійнай адукацыі

**Салата «Пераможная шайба», «Чэмпіён», «Мазурка», рулецікі «Беларускі паланэз»... На ўваходзе ў Футбольны манеж, дзе ўчора стартаваў 1-ы нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства «WorldSkills Belarus — 2014», першымі прымалі ўдар на сябе будучыя майстры кулінарыі. Гэты павільён гледачы ўзялі ў шчыльнае кальцо, як і павільён, дзе шчыравалі кандытары. Яно і зразумела, бо глядзець за тым, як гатуюць іншыя, гэта ж не самому каля пліты стаяць! Усё прыгожа, пахі казычуць нос... Быццам бы глядзіш серыял «Кухня», толькі наяве, а не па тэлевізары...**

Конкурс праводзіцца ў рэжыме рэальнага часу. У першы дзень перад канкурсантамі стаяла задача прыгатаваць дзве стравы: асноўную рэстаранную мясную страву і фірменную салату. На другі дзень — прадэманстраваць мастацкую нарэзку гародніны і садавіны, скласці кампазіцыю і правесці яе прэзентацыю. Кандытарам, напрыклад, трэба было прыгатаваць мастацкую кампазіцыю на тэму «Вясна».

Між іншым школьнікаў, якія гулялі паміж павільёнамі, вельмі ўразіла інфармацыя, прадстаўленая на стэндзе: «У рэстаране, сталовай ці кавярні мінімальны заробак кандытара складае ад 5 да 9 мільёнаў рублёў у месяц.

СТАР. 2

■ На радасць чытачу

# ПАХВАЛА КНІЖНАСЦІ

## Сярод пераможцаў конкурсу «Мастацтва кнігі» — два праекты Выдавецкага дома «Звязда»

**Падарункавыя выданні з залатым абрэзам, кнігі ў скураных вокладках і прыгожых сувенірных каробках, альбомы, трансформеры, даследаванні, прысвечаныя гісторыі кнігавыдання... Самыя прыгожыя выданні, што пабачылі свет у краінах СНД цягам 2013 года, былі разгледжаны сябрамі кампетэнтнага журы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Тут прайшоў XI Міжнародны конкурс «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД.**




Сёлета ўдзельнікамі гэтага адметнага спаборніцтва сталі 77 выданняў павышанай якасці з 9 краін СНД: Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Украіны. Міжнароднае журы конкурсу разглядала кнігі па дзевяці намінацыях: «Садружнасць», «Мая краіна», «Кніга для дзяцей і юнацтва», «Дыялог культур», «Навука і адукацыя», «Арт-кніга», «Аддрукавана ў Садружнасці», «Пераможца», «Гран-пры».

СТАР. 2

■ Парламенцкі дзённік

# УПОР НА ПРАФІЛАКТЫКУ

## Дэпутаты прынялі змяненні ў закон аб ахове здароўя

**Дзеючы закон дапоўнены артыкуламі «Медыцынская прафілактыка захворванняў», «Дыспансерызацыя насельніцтва», «Віды медыцынскіх экспертыз», «Медыцынскі агляд», «Зварот медыцынскіх вырабаў. Дзяржаўны кантроль за якасцю медыцынскіх вырабаў і іх зваротах», «Меры па ахове здароўя насельніцтва». Шэраг артыкулаў выкладзены ў новай рэдакцыі, у іншыя нормы ўнесены змяненні і дапаўненні.**

— Людзей перш за ўсё цікавяць змяненні, звязаныя з перарываннем цяжарнасці, стэрылізацыяй... Гэтыя пытанні выклікалі найбольшую дыскусію пры падрыхтоўцы дакумента, — заўважыў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай прыняццю законапраекта ў другім чытанні **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Аляксандр ЦАЦОХА.** — Але я хацеў бы перш за ўсё звярнуць увагу на новыя артыкулы, звязаныя з медыцынскай прафілактыкай і дыспансерызацыяй. Гэта вельмі важныя моманты ў вышэйзгаданым дакуменце. Як і яго прафілактычная накіраванасць у цэлым.

Размова ідзе пра тое, што пасля прыняцця абноўленага закона органы рэспубліканскага кіравання, мясцовай улады ўсіх узроўняў павінны будуць не проста дэклараваць прыняцце мер для прафілактычнай медыцыны, але і ствараць умовы для ажыццяўлення такой медыцыны, патлумачыў парламентарый. Да таго ж да прафілактыкі будуць падключаны грамадскія арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, фізічныя асобы.

— Будучае за прафілактычнай медыцынай, — упэўнены Аляксандр Цацоха. — Нашмат прасцей пазбягаць сітуацыю, чым ліквідаваць яе наступствы.

СТАР. 2

# УПОР НА ПРАФІЛАКТЫКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## АДМОВА ПА ЭТЫЧНЫХ МЕРКАВАННЯХ

Адна з найбольш гучных паправак у Закон «Аб ахове здароўя» датычыцца права ўрача на адмову ў правядзенні аборту, калі такая адмова не пагражае жыццю жанчыны. Такая адмова магчыма пры наяўнасці пісьмовага паведамлення кіраўніку арганізацыі аховы здароўя. Пры гэтым на апошняга ўскладаецца абавязак арганізацыі правядзення штучнага перарывання цяжарнасці пацыентцы іншым урачом-спецыялістам.

У абгрунтаванні неабходнасці прыняцця гэтага законапраекта гаворыцца, што ўвядзенне такой нормы не з'яўляецца навацыяй. Падобная норма змешчана ў адным з артыкулаў адпаведнага федэральнага закона Расійскай Федэрацыі. Таксама права ўрача на адмову ад правядзення аборту замацавана ў Жэнеўскай дэкларацыі Сусветнай медыцынскай асацыяцыі, у адпаведнасці з якой у выпадку, калі асабістыя перакананні не дазваляюць урачу зрабіць медыцынскі аборт, ён павінен перадаручыць пацыентку кампетэнтнаму калегу.

Акрамя таго, прадугледжваецца ўстанавіць абавязак арганізацый аховы здароўя ствараць умовы для перадабортнага псіхалагічнага кансультавання жанчын, якія звярнуліся для правядзення штучнага перарывання цяжарнасці. Арганізацыя такога кансультавання будзе садзейнічаць зніжэнню колькасці зробленых абортаў і, як вынік, паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі, лічаць распрацоўшчыкі законапраекта.

Дакументам таксама дапаўняецца пералік выпадкаў, калі ўрачэбная тайна можа быць выдадзена без згоды пацыента. Напрыклад, па пісьмовым запыце страхавых арганізацый, па запытах мясцовых органаў ваеннага кіравання для мэт медыцынскага агляду грамадзян пры прызыве на воінскую службу; па пісьмовым запыце органаў дазнання ў сувязі з правядзеннем экспертызы для вырашэння пытання аб распачынанні крымінальнай справы; па пісьмовым запыце органаў унутраных спраў аб праходжанні (непраходжанні) медыцынскага пераагляду вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, аб наяўнасці захворвання або проціпаказання, якія перашкаджаюць кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі, самаходнымі машынамі і г.д

## СУПРАЦОЎНІЦТВА З РАСІЯЙ

Беларускія дэпутаты таксама ратыфікавалі пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб супрацоўніцтве ў галіне выкарыстання і развіцця расійскай глабальнай навігацыйнай спадарожнікавай сістэмы ГЛАНАСС.

Як адзначыў **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Сяргей ГУРУЛЁЎ,** мэтай пагаднення ў тым ліку з'яўляецца ажыццяўленне сумеснай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем і развіццём сістэмы ГЛАНАСС і адпаведных спадарожнікавых навігацыйных тэхналогій. Пагадненне паміж урадамі дзвюх краін падпісана 13 снежня 2013 года ў час пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы.

Маецца на ўвазе рэгламентацыя супрацоўніцтва па стварэнні беларускай наземнай інфраструктуры сістэмы ГЛАНАСС, якая ўключае беларускія наземныя функцыянальныя дапаўненні сістэмы, а таксама навігацыйнай апаратуры спажыўцоў.

Прадугледжваецца ўзаемны абмен навуковай і тэхнічнай інфармацыяй, эксперыментальнымі данымі, вынікамі доследна-канструктарскіх работ, матэрыяламі, абсталяваннем і праграмным забеспячэннем. Сяргей Гурулёў адзначыў, што цяпер вядзецца ўзгадненне пазіцый з расійскім бокам.

## ПСІХАТРОПНЫЯ ЛЕКІ — ТОЛЬКІ ПА ДАКУМЕНТАХ

Яшчэ адна ратыфікацыя Палаты прадстаўнікоў датычыцца пагаднення аб парадку перамяшчэння наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў па тэрыторыі Мытнага саюза. Пагадненне было падпісана ў Мінску ў кастрычніку 2013 года ў мэтах вызначэння парадку перамяшчэння і перавозкі (унутранага транзіту) наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў юрыдычнымі асобамі пры ажыццяўленні гандлю паміж бакамі, для правядзення клінічных даследаванняў, экспертызы, дзяржаўнай рэгістрацыі і кантролю якасці, у аптэчках першай дапамогі на асобных відах транспарту, а таксама фізічнымі асобамі для асабістага карыстання.

Як растлумачыў, прадстаўляючы дакумент парламентарыям, **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО,** дзеянне пагаднення распаўсюджваецца на юрыдычных і фізічных асоб. У прыватнасці, адным з артыкулаў прадугледжана, што фізічным асобам, зарэгістраваным у якасці суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, забаронена ажыццяўляць перамяшчэнне, а таксама перавозку (унутраны транзіт) вышэйназваных рэчываў у сувязі з ажыццяўленнем імі гэтай дзейнасці. Разам з тым, фізічным асобам дазваляецца перамяшчаць і перавозіць (унутраны транзіт) абмежаваную колькасць наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў у выглядзе лекавых сродкаў для асабістага прымянення па медыцынскіх паказаннях. Для гэтага фізічнай асобе неабходна мець пацвярджальныя медыцынскія дакументы або іх завераныя копіі. Юрыдычныя асобы ажыццяўляюць перамяшчэнне пры наяўнасці дазвольных дакументаў на ўвоз (вываз), што выдаюцца кампетэнтнымі органамі бакоў, у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія замацаваны ў адным з артыкулаў гэтага міжнароднага дагавора.

«Ратыфікацыя і рэалізацыя палажэнняў пагаднення будуць садзейнічаць далейшаму паглыбленню ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў Мытнага саюза ў галіне забеспячэння кантролю за легальным перамяшчэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў. Гэтыя дзеянні адпавядаюць інтарэсам нашай дзяржавы», — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Усяго на пасяджэнні чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі 21 мая дэпутаты разгледзелі 9 законапраектаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## «НАЛАМАЛА» ДРОЎ

**Лясгасы краіны ліквідуюць наступствы шквалістых вятроў.**

Згодна з папярэднімі данымі, у выніку шквалістых вятроў, якія прайшлі над тэрыторыяй Беларусі 17 і 19 мая, у лясным фондзе Міністэрства лясной гаспадаркі было пашкоджана амаль 16 тысяч кубаметраў драўніны. Суцэльныя санітарныя высечкі неабходна правесці больш чым на 57 гектарах лесу.

Акрамя таго, ёсць і мноства адзінкавых пашкоджаных дрэў — усяго каля 4,2 тысячы кубаметраў драўніны.

Ад моцнага ветру пацярпелі ў асноўным лясы на паўднёвым усходзе краіны. У прыватнасці, у Магілёўскай вобласці і часткова — у Гомельскай, паведаміла **прэс-сакратар Мінлясгаса Ружэна НАВІЦКАЯ.** Усяго ад удару стыхіі лясныя насаджэнні пацярпелі ў 9 лясгасах краіны.

Ва ўсіх цяпер вядуцца работы па ліквідацыі наступстваў. Частка нарыхтаванай драўніны будзе рэалізавана дрэваапрацоўчым прадпрыемствам, астатняе пойдзе на дровы. У месцах высечак будзе праведзена лесааднаўленне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У МІНСКУ ПРОЙДЗЕ ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦТВАЎ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

***ІІ Фестываль мастацтваў беларусаў свету пройдзе ў верасні ў падчас свята Дня горада. Аб гэтым учора на прэс-канферэнцыі паведаміў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міністэрства культуры Беларусі Міхаіл Рыбакоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.***

«Гэты фестываль бярэ пачатак з Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, — сказаў Міхаіл Рыбакоў. — Прадстаўнікі дыяспары стараюцца набыць вопыт правядзення такіх форумаў. З іх падачы ў многіх рэгіёнах пачынаюць арганізоўвацца такія мерапрыемствы».

Форум праводзіцца з мэтай шырокай прэзентацыі Беларусі, дасягненняў мастацкай творчасці, падтрымкі праектаў суайчыннікаў, якія пражываюць у розных краінах, наладжвання кантактаў з імі і аказання арганізацыйна-метадычнай дапамогі з боку дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый, мастацкіх калектываў, дзеячаў культуры і мастацтваў Беларусі.

Першы фестываль мастацтваў беларусаў свету прайшоў у 2011 годзе. Ён сабраў амаль 250 прадстаўнікоў беларускай дыяспары з Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Нідэрландаў, Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны і ЗША.

# ПАХВАЛА КНІЖНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, упершыню члены журы працавалі ў адпаведнасці з новым палажэннем аб конкурсе. Так, калі раней краіна магла прадставіць да 5 кніг у кожнай з намінацый, то цяпер колькасць конкурсных выданняў ад адной дзяржавы зменшылася да двух. З аднаго боку, змяншэнне ліку разглядаемых выдавецкіх праектаў ускладніла задачу адбору кніг на ўзроўні краіны, але з іншага — спрасціла працу журы. Такім чынам суддзі, выдаўцы, пісьменнікі, мастакі кніг з розных краін змаглі больш увагі і часу прысвяціць разгляду кожнага з конкурсных праектаў, ацаніць іх тэматыку, дызайн, мастацкую структуру, іншыя станоўчыя якасці.



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

А прадстаўленыя на конкурс выданні сапраўды ўражвалі. Варта згадаць хаця б кнігу-трансформер, аформленую ў тэхніцы шаўкаграфіі, — выдатны альбом Вадзіма Гіпенрэйтэра «Запаведная краіна» (быў прызнаны лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Гран-пры»), ці грунтоўнае даследаванне «Татарская кніга», прысвечанае вывучэнню традыцый кніжнасці ў татар ад старажытнасці і да нашага часу (уладальнік дыплома ІІІ ступені ў намінацыі «Дыялог культур»).

Як жа на фоне такіх яркіх і незвычайных праектаў выглядае беларуская кніга?

— Вельмі дастойна, добра, трывала, — разважае член міжнароднага журы, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства Міхаіл Баразна. — У нас ёсць моцная мастацкая школа, літаратурны асяродак не страціў сваіх магчымасцяў, ды і можна сцвярджаць, што беларусы — прагны да ведаў народ. Таму і выдаўцы, мастакі, дызайнеры імкнуцца гэтую прагу падтрымаць добрымі кнігамі, страюцца, каб выданні неслі не толькі веды, але і былі проста прыгожымі.

Гэтае меркаванне Міхаіла Рыгоравіча пацвердзілася вынікамі конкурсу. Так, па рахунку беларускіх выдаўцоў — 9 узнагарод у розных намінацыях. У іх ліку — дыплом лаўрэата ў намінацыі «Гран-пры» за рэалізацыю праекта «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» выдавецтва «Чатыры чвэрці». Дарэчы, два дыпломы прысуджаны Выдавецкаму дому «Звязда». Пераможцам у намінацыі «Садружнасць» стала камплектнае выданне з 11 кніг серыі «Сугучча сэрцаў». А дыплом І ступені ў намінацыі «Перамога» атрымае кніга Галіны Скарынка і Сяргея Лапарова «Партызанская зброя». У гэтай жа катэгорыі дыплом ІІ ступені прысуджаны праекту В. Ермаловіча «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1945», што выйшаў у выдавецтве «Беларусь».

Спецыяльны дыплом у намінацыі «Дыялог культур» выправіцца ў полацкае Выдавецтва Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра. Журы ўразіла кніга «Акафіст прападобнай маці нашай Ефрасінні, княжне Полацкай». Дыплом ІІІ ступені ў намінацыі «Мая краіна» прысуджаны кнізе Аляксандра Аляксеева і Алега Лукашэвіча «Скарбы Беларусі» выдавецтва «Чатыры чвэрці». У ліку лепшых кніг для дзяцей і юнацтва — праект выдавецтва «Кніжны Дом» «Новыя прыгоды Дэніка» папулярнага дзіцячага пісьменніка Віктара Ляскоўскага. Ён атрымае дыплом ІІІ ступені ў гэтай намінацыі. Лаўрэатам дыплома ІІ ступені ў намінацыі «Арт-кніга» стане сумеснае выданне Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і выдавецтва «Калекшн» «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», а лепшай работай у катэгорыі «Аддрукавана ў Садружнасці» названы праект С. Лявонцьевай і Г. Нячаевай «Кніжная культура. Ветка», што былі падрыхтаваны выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» і надрукаваны на Падольскай фабрыцы афсетнага друку.

Па традыцыі, дыпломы пераможцам будуць уручаны восенню, падчас XXVII Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. На гэтым форуме ў экспазіцыі Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях Расійскай Федэрацыі можна будзе пабачыць і ўсе выданні — лаўрэаты XI Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД. Акрамя таго, самыя прыгожыя кнігі СНД 2013 года па традыцыі будуць прадстаўлены ў межах Дня беларускага пісьменства ў Заслаўі. Затым яны папоўняць кніжны фонд Музея гісторыі СНД у Мінску.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

# ПРАЦАВАЦЬ ГАЛАВОЙ, СЭРЦАМ І... РУКАМІ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прафесіяналы, якія выконваюць індывідуальныя заказы і працуюць у атэлях VIP-класа ці рэстаранах такога ўзроўню, зарабляюць больш за 10 мільёнаў рублёў».

— Нішто сабе! Гэта значыць за такую смакату можна яшчэ і неблагія грошы атрымліваць, — абмяркоўвалі ўбачанае дзве сяброўкі.

Не менш народу сабралася і каля павільёна, дзе спаборнічалі ў майстэрстве цырульнікі.

— У першы конкурсны дзень удзельнікі выконваюць мужчынскую класічную стрыжку з укладкай для ўрачыстага выпадку і вясельную прычоску, — патлумачыла «дзеянне» на сцэне **начальнік аддзела ўпраўлення навукова-метадычнага забеспячэння прафесійнай адукацыі РІПА Аксана ХАДАРЭНКА.** — Выкананне мужчынскай класічнай стрыжкі лічыцца найбольш цяжкім заданнем. Нават больш цяжкім, чым выкананне жаночай стрыжкі і прычоскі. Дарэчы, вясельная прычоска будзе выконвацца метадам пляцення — гэта модны зараз трэнд. Прычым пляценне павінна складаць не менш як палову прычоскі. У конкурснай праграме прадугледжана таксама і гістарычная катэгорыя. Прычоска павінна адлюстроўваць гістарычную эпоху Бідэрмаер: мець локаны, буклі, багты, вузлы рознай формы... А вось выкарыстанне накладных матэрыялаў і любых каркасаў катэгарычна забараняецца. Эпоха Бідэрмаер — гэта эпоха Наталі Ганчаровай, эпоха, калі жанчына была люстэркам фінансавага дабрабыту свайго мужа. Да таго ж канкурсантам трэба было загадзя прадумаць касцюм для сваёй мадэлі, які будзе падтрымліваць цэласнасць вобраза і раскрываць зададзеную тэму. Касцюм мадэлі і макіяж таксама ацэньваюцца экспертамі...

Але, шчыра кажучы, канкурсантаў было ўсё ж такі шкада, бо даказваць свой прафесіяналізм ім даводзілася пад прыцэлам дзясяткаў вачэй. І не толькі экспертаў, але і школьнікаў і іх педагогаў.

Сёння існуе сусветная тэндэнцыя зніжэння ў моладзі інтарэсу да рабочай прафесіі. Гэта пацвердзіў **і прэзідэнт Міжнароднай некамерцыйнай асацыяцыі World Skills International (WSI) Сайман БАРТЛІ,** які наведаў першы беларускі нацыянальны чэмпіянат. Ён расказаў, што рух World Skills зарадзіўся напрыканцы 40-х гадоў мінулага стагоддзя ў Іспаніі, дзе ўрад быў занепакоены вялікім беспрацоўем сярод моладзі і нізкай вытворчасцю працы. Тады і з'явілася ідэя праводзіць спаборніцтвы сярод моладзі, каб параўнаць, як у розных краінах вучаць тым ці іншым навыкам, а таксама пераканаць бацькоў і выкладчыкаў школ, што прафесійная адукацыя і тэхнічная праца вартыя большай увагі.

— Вы кажаце, што моладзь баіцца фізічнай працы і не жадае працаваць рукамі? Я мяркую, што гэта віна не моладзі, а наша з вамі, — падкрэслівае Сайман Бартлі. — Мы самі, намаганнямі бацькоў, настаўнікаў і ўрада, стварылі гэтую сістэму, калі выстаўлялі галоўным крытэрыем поспеху менавіта атрыманне вышэйшай адукацыі. Давайце паглядзім на выпускнікоў універсітэтаў: я лічу, што яны працуюць сэрцам і галавой. Але ж прадстаўнікі прафесій, якія прапануе моладзі сістэма прафесійнай адукацыі, працуюць галавой, сэрцам і рукамі. А тры заўсёды лепш чым два?

У конкурснай праграме «WorldSkills Belarus — 2014» прадстаўлена 20 прафесій і кампетэнцый. Між іншым, па выніках чэмпіянату будзе прымаецца рашэнне аб тым, хто будзе прадстаўляць Беларусь у наступным годзе на сусветных спаборніцтвах у Бразіліі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «УСІХ ПАВАЖАЕМ, НІКОГА НЕ БАІМСЯ»

## Групавы турнір чэмпіянату свету па хакеі беларуская зборная завяршыла паядынкам супраць каманды Расіі

**У гэтым матчы многія не бачылі турнірнага значэння, але толькі не хакеісты. Зачапіць, перамагчы магутнага суседа, лідара турніру — гэта ж за радасць! Тым больш, падобны досвед, як раней пісала «Звязда», у нашых суайчыннікаў ёсць. Аднак справіцца з Расіяй хлопцы не здолелі і саступілі 1:2. Даём слова ўдзельнікам сустрэчы:**



**Глен ХЭНЛАН, галоўны трэнер зборнай Беларусі:**

— Прайсці ўсе матчы ў групе без паражэнняў — важкая заяўка ад зборнай Расіі. Але я ганаруся і сваімі хлопцамі. Тое, што прадэманстравалі гэтыя 11 нападаючых і 7 абаронцаў, — фенаменальна. Безумоўна, я незадаволены паражэннем, але якасць іх гульні заслугоўвае павагі. Краіна павінна ганарыцца імі.

***— Сапернікам у чвэрцьфінале будзе зборная Швецыі.***

— Мы добра ведаем гэтага саперніка. Яны — чэмпіёны свету. Гэтым усё сказана. Але я паўтару тое, што ўжо казаў: мы ўсіх паважаем, але нікога не баімся.

***— А ці памятаеце матч, калі беларусы перайгралі шведаў на Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці?***

— Падобнае ў мяне пыталі разоў 50 з 2005 года, калі я ўпершыню ўзначаліў зборную Беларусі. Але мне тады было 15 гадоў, — жартуе Хэнлан. — І я не вельмі добра памятаю тую гульню. Памятаю толькі тое, што яна была цудоўнай, памятаю шайбу Копаця, поспех Крыкунова (тагачасны трэнер зборнай — **Аўт.**) і тое, што лепшым прызналі Мезіна. А яшчэ 20 лютага, калі адбыўся паядынак, я святкую дзень народзінаў.

***— Чаму ў заяўцы на матч не было Андрэя Мезіна?***

— Сітуацыя наступная: Мезін атрымаў пашкоджанне, і яго далейшы ўдзел на чэмпіянаце пад пытаннем. Грабоўскі ў мінулым матчы таксама траўмаваў ніжнюю частку цела. У Калюжнага старыя праблемы са спінай. Вырашылі не рызыкаваць ім у матчы, якія нічога не значыць.

**Уладзімір ДЗЯНІСАЎ, абаронца зборнай Беларусі:**



— Для нас важны кожны матч. Супраць Расіі наша каманда змагалася да апошняга. Так, мы правалілі другі перыяд, але ў трэцім перыядзе спрабавалі вярнуцца ў гульню. Акрамя таго, нам дапамаглі варатары. Мы маглі закінуць яшчэ, але не здолелі. Сёння Расія рухалася, кантралявала шайбу лепш, чым мы. Трэба прызнаць, у гэтым сапернік меў перавагу.

**Алег ЗНАРОК, галоўны трэнер зборнай Расіі:**



— Цяжка настройваць хакеістаў на матч, які нічога не вырашае. Гэта адчуў яшчэ на раскатцы. Але перамога ёсць перамога. І мы таксама атрымалі ўрок ад гэтай гульні.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



### ВЫНІКІ АПОШНІХ МАТЧАЎ ГРУПАВОГА РАЎНДА

**Група А:** Нарвегія — Канада — 2:3, Данія — Славакія — 3:4, Чэхія — Францыя — 5:4.

**Група В:** Германія — ЗША — 4:5, Латвія — Швейцарыя — 2:3, Расія — Беларусь — 2:1.




## Выхад беларусаў у плэй-оф — вынік вялікай самаадачы

**Такое меркаванне выказаў карэспандэнту БЕЛТА вядомы беларускі спартсмен, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Вадзім Дзевятоўскі.**

«Чэмпіянат свету атрымаўся. Паглядзіце на балельшчыкаў, на гледачоў. Нават той, хто не любіў хакей, сёння далучаны да ЧС-2014», — адзначыў Вадзім Дзевятоўскі. Ён нагадаў, што выхад беларускай дружыны ў плэй-оф — гэта той мінімум, якога чакалі ад каманды. «Але я як спартсмен разумею цану гэтага выхаду — гэта самаадача. Мы бачым, што хлопцы змагаюцца. Іх няма ў чым папракнуць. Памылкі, вядома, ёсць, але з кім мы гуляем: ЗША, Швейцарыя...» — падкрэсліў Вадзім Дзевятоўскі.

«Людзі, якія гаварылі, што чэмпіянат не атрымаецца, глыбока памыляліся. Мы бачым на дзвюх пляцоўках у Мінску штосьці неверагоднае і надзвычай яркае», — дадаў спартсмен.

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што, напрыклад, зборная Францыі паказала сябе з нечаканага боку. Ад гэтых хакеістаў не чакалі такой барацьбы і такіх вынікаў. «Яны даюць аб сабе знаць самым элітным камандам — Швецыі, Канады. Хакей атрымаўся, а тое, што беларусы вырвалі перамогу ў Германіі, — гэта, вядома, фантастыка» — адзначыў Вадзім Дзевятоўскі.

Гаворачы аб матчы беларускай дружыны са зборнай Расіі, ён падкрэсліў, што вынік усё роўна нядрэнны. Беларусы гулялі на роўных без двух вядучых ігракоў, і гэта дае шанц на тое, што яны змогуць паўтарыць подзвіг 2002 года са шведамі. «Лічу, шведы ўжо псіхалагічна на нас настройваюцца. Яны разумеюць, што ў сябе дома мы пастараемся даказаць — гэта была не выпадковасць», — лічыць спартсмен.



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

# «НА ЛЁДЗЕ МЫ — АДНО ЦЭЛАЕ!»

**Пасля матча з расіянамі галкіпер зборнай Беларусі Кевін Лаланд, які ўзначальвае ліст самых надзейных варатароў чэмпіянату свету, падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» ўражаннямі ад гульні.**



### ЛЕПШЫЯ ГАЛКІПЕРЫ ЧЭМПІЯНАТУ:

1) Кевін Лаланд (Беларусь) — прапусціў 2 шайбы, паказчык эфектыўнасці — 96,36%.
2) Бэн Скрывенс (Канада) — 4 шайбы, 95,35%.
3) Сяргей Бабroўскі (Расія) — 6 шайбаў, 94,83%.
4) Стэфан Соберг (Нарвегія) — 6 шайбаў, 94,83%.
5) Андэрс Нільсан (Швецыя) — 9 шайбаў, 93,48%.

***— Кевін, каманда выдатна змагалася ў трэцім перыядзе, але параўнаць лік так і не атрымалася. Як думаеце, чаму?***

— Было відаць, з якім жаданнем гулялі хлопцы, як граматна прэсінгавалі саперніка. Але і расіяне класна абараняліся, Бабroўскі (Сяргей Бабroўскі — варатар зборнай Расіі. — **Аўт.**) некалькі разоў выратаваў сваю каманду. Дзесьці трохі не пашанцавала, дзесьці сапернік згуляў надзейна. Ведаю адно: хлопцы не шкадавалі сябе, выкладваліся па поўнай, да апошняй секунды...

***— Не здзівіліся, што на матч вас заявілі другім галкіперам?***

— Не. У папярэдніх матчах Віталь (Віталь Коваль — варатар зборнай Беларусі. — **Аўт.**) выдатна праявіў сябе, таму давер трэнера цалкам апраўданы. І сёння Віталь дзейнічаў класна. Шкада, што зноў атрымаў пашкоджанне. Спадзяюся, ён яшчэ зможа згуляць на чэмпіянаце.

***— Тым не менш, калі вы з'яўляецеся ў беларускіх варотах — гульня каманды мяняецца ў лепшы бок. І статыстыка гэта пацвярджае: сёння вы — лепшы галкіпер турніру!***

— Любому гульцу прыемна прыносіць карысць сваёй зборнай. І калі я разумею, што ў мяне атрымліваецца дапамагаць хлопцам, то вельмі шчаслівы.

Гэтыя эмоцыі нельга перадаць на словах. І тут няважна, праводзіш ты на лёдзе чатыры хвіліны ці дваццаць, першым нумарам ці другім.

***— Здаецца, што зараз вы не проста робіце сваю работу, але сапраўды атрымліваеце асалоду...***

— Так і ёсць! Мне не хочацца выходзіць на лёд і рабіць памылкі перад шматтысячнымі трыбунамі «Мінск-Арэны», якія так крута нас падтрымліваюць. Паверце, гэта выдатна стымулюе.

***— У паядынку з расіянамі вы зноў былі прызнаны лепшым гульцом матча. Наколькі гэта важна для вас?***

— Насамрэч, не вельмі важна. У тым сэнсе, што хакей — гэта камандная гульня, і за вынік матча адказныя абсалютна ўсе. Але, нягледзячы на паражэнне, я ганаруся тым, як мы сёння згулялі. Лепшымі былі ўсе — і Андрэй Сцяпанаў, у якога быў шыкоўны момант, і Андрэй Касціцын, які за некалькі секунд да завяршэння матча правёў прыгожую атаку. На лёдзе мы адно цэлае, таму выдзяляць кагосьці... не бачу ў гэтым вялікага сэнсу.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

### І яшчэ крыху статыстыкі...

- Лепшыя ў рэалізацыі меншасці — зборныя Канады і Беларусі; на іх рахунку па дзве шайбы.
- Лепшыя ў рэалізацыі большасці — амерыканскія хакеісты, якія закінулі 10 шайбаў за 36 хвілін пры колькаснай перавазе.
- Самая недысцыплінаваная каманда — зборная Латвіі, у якой 147 штрафных хвілін (у сярэднім за гульню — 21 хвіліна). Галоўны «штрафнік» — Каспар Даўгавіньш, які за 7 матчаў набраў 42 хвіліны штрафу.
- Самая дысцыплінаваная каманда — зборная Германіі (за 7 матчаў усяго толькі 44 хвіліны штрафу).
- Лепшы бамбардзір — форвард расіян Віктар Ціханаў (14 балаў па сістэме «гол+пас» — 7+7). Лідары зборнай Беларусі — Міхаіл Грабоўскі і Сяргей Касціцын — па 8 балаў (4+4).
- Самая рэзультатыўная каманда — зборная Расіі. На яе рахунку 31 шайба. У расіян таксама лепшая абарона — усяго толькі 7 прапушчаных шайбаў.
- Самыя «пасіўныя» — італьянцы, у актыве якіх толькі 6 выніковых атак. Самая «дзіравая» абарона ў казахстанцаў — 32 прапушчаныя шайбы.
- Лепшы паказчык карыснасці ў двух расіян — Віктара Ціханава і Антона Бялова (+9). Лепшы сярод беларусаў — Сяргей Касціцын (+6).

## ■ ЖКГ: затраты і аддача

# ЧАС ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ НОРМЫ І ЎМАЦАВАЦЬ ДЫСЦЫПЛІНУ

**Як вядома, насельніцтва заўсёды цікавіць, адкуль узнікаюць тыя ці іншыя лічбы на аплату камунальных паслуг, наколькі яны абумоўлены рэальнымі затратамі галіны. Такімі ж пытаннямі задаліся і супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці падчас праверкі прадпрыемства «Жабінкаўская ЖКГ».**

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення абласнога КДК Аляксандра ПУЗІКА,** спачатку правялі хранаметражны маніторынг пэўных відаў работ па абслугоўванні жыллёвага фонду. Пачалі з самага простага — з замены электрычных лямпачак. І аказалася, што гэту простую аперацыю майстар участка праводзіць прыкладна ў 1,5 раза хутчэй, чым прадугледжана Галіновымі нормамі часу на тэхнічнае абслугоўванне жыллёвага фонду. Ёсць пытанні і па іншых відах работ.

А вось аналіз колькасці працаўнікоў прадпрыемства навёў на іншыя разважанні. Па стане на 1 студзеня 2014 года колькасць працуючых склала 330 чалавек, або 67,2% ад нарматыўнай колькасці і 81,3% ад штатнай колькасці.

— Мы лічым, — кажа Аляксандр Пузік, — што наспела неабходнасць пераглядзець як нормы часу на тэхнічнае абслугоўванне жыллёвага фонду, так і нарматыўную колькасць працаўнікоў прадпрыемства. Такая аптымізацыя, на наш погляд, паспрыяе росту агульнай дысцыпліны на прадпрыемстве.

А пакуль што маюць месца розныя, хоць і невялікія, але даволі прыкрыя парушэнні. Калі дапускаецца нейкі перарасход, то яго могуць, што называецца, з чыстай душой спісаць на сабекошт жыллёва-камунальных паслуг. Так было з палівам. Яго расходавалі на 16,6 мільёна рублёў звыш ліміту, і грошы «павесілі» на сабекошт аказаных паслуг. Сюды ж аднеслі і 20 мільёнаў рублёў, затрачаных на рамонт службовага аўтамабіля. Машына была пашкоджана ў аварыі, а віноўнікам здарэння прызнаны дырэктар прадпрыемства.

Выяўлены факты завышэння кошту аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ па аб'ектах будаўніцтва, капітальнага і бягучага рамонту жыллёвага фонду.

І такіх пытанняў падчас праверкі спецыялістамі КДК Жабінкаўскай ЖКГ паўстала нямала. Асобным з іх пасля правядзення неабходных працэдур дадуць прававую ацэнку адпаведныя дзяржаўныя органы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

---

03 июня 2014 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1) О создании обществом унитарного предприятия.

2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 28.05.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200295903

Совет директоров.

---

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, *что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»* 27 мая 2014 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

**Повестка дня**

1. О передаче в собственность Республики Беларусь, для закрепления на праве оперативного управления за Следственным комитетом Республики Беларусь имущества ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 19 мая 2014 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 19 по 23 мая 2014 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 23 мая 2014 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 59 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

**Телефон для справок: 8(017) 229 64 59.**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**23.06.2014 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг.**

### Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А.

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв.м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, руб. | Размер задатка, руб. | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, здание автоматической телефонной станции, помещение на 1 эт., г. Гродно, ул. Ожешко, д. 9 | Лот № 1 | 17,1 | 2,0 | 367 650 | 36 765 | Помещение находится на первом этаже двухэтажного кирпичного здания в центре города. В помещении имеется естественное освещение, центральное отопление, в здании имеется водоснабжение, канализация, телефонизировано |
| Капитальное строение, здание АТС-2, помещение на 3 эт., Гродненская обл., г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3 | Лот № 2 | 70,4 | 2,0 | 1 513 600 | 151 360 | Помещение находится на третьем этаже четырехэтажного блочного здания в центральной части города. Имеется естественное освещение, центральное отопление, водоснабжение, канализация, электроснабжение, телефонизировано. Площади находятся в удовлетворительном состоянии. |

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц – резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 30 базовых величин.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 с 23.05.2014 по 22.06.2014 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 22.06.2014, не рассматриваются.**

Информация о ранее проведенных аукционах была размещена в газете «Звязда» от 16.11.2013 № 216, от 20.07.2013 № 133, № 35 от 25.02.2014.

**Телефоны для справок (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

### Извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»

| Лот № 1 | Компрессорная станция «Ивацевичи» | адрес: Брестская область, Ивацевичский р-н, 2,2 км юго-западнее деревни Холопья | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 7 841 350 000 | 784 135 000 | 5 |

**СОСТАВ ЛОТА № 1**

1. Здание КЦ-3 с инв. №122/С-2251. Литер А, а2/к, Б (б1, б2, б3, б4), В (в1, в2, в3). Назначение – здание нежилое. Год постройки – 1982. Этажей – 2. Площадь застройки/общая– 2254,4 м²/2476,0 м². Фундамент – бетон. Наружные стены – кирпич, панели металлические. Внутренние стены, перегородки – кирпич. Перекрытия междуэтажные – металлические. Крыша – лист асбестоцементный. Полы – бетон, плитка, дощатые. Проемы оконные – ПВХ. Проемы дверные – металлические, ПВХ, деревянные, филенчатые. Внутренняя отделка – гипсокартон, штукатурка. Электроснабжение – скрытая проводка. Водопровод – сетевое (артскважина). Канализация – центральная. Ванные (души), напольные электроплиты, телефонная связь имеются. Вентиляция – смешанная.
2. Здание проходной КЦ-3 с инв. №122/С-2246. Назначение – здание нежилое. Год постройки – 1982. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 132 м²/95,1 м². Фундамент – бутобетон. Наружные, внутренние капитальные стены, перегородки – кирпич. Перекрытия чердачные – деревянные. Крыша – шиферная. Полы – дощатые, бетонированные. Проемы оконные – двойные. Проемы дверные – простые. Наружная отделка цоколя, стен, внутренняя отделка – оштукатурено. Электроснабжение – скрытая проводка. Водопровод, канализация, телефонная связь имеются. Вентиляция – естественная.
3. Здание санитарно-бытового корпуса с инв. № 122/С-2250. Назначение – здание нежилое. Год постройки – 1982. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 179 м²/111,5 м². Фундамент – бутовый. Наружные, внутренние капитальные стены, перегородки – кирпич. Перекрытия чердачные – ж/б плита. Крыша – шиферная. Полы – бетонные, плитка, дощатые. Проемы оконные – деревянный блок. Проемы дверные – филенчатые. Наружная отделка цоколя, внутренняя отделка – оштукатурено. Водопровод, канализация – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка. Газоснабжение – сетевое. Вентиляция – естественная. Радио, телефонная связь имеются.
4. Здание котельной КЦ-3 с инв. № 122/С-2248. Литер А1/м. Назначение – здание нежилое. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 168 м²/276,9 м². Фундамент – бетон, столбчатый. Наружные стены – ж/б, панели металлические. Перекрытия – металлические. Крыша, полы – металл. Проемы оконные – простые. Отопление – водяное (в настоящее время здание не отапливается). Электроснабжение – открытая проводка. Водопровод – сетевой. Канализация – центральная. Вентиляция – естественная.
5. Здание КТП АВО газа КЦ-3 с инв. № 122/С-2249. Назначение – здание нежилое. Год постройки – 1982. Этажей – 2. Площадь застройки/общая – 77 м²/145,5 м². Фундамент – бутобетон. Наружные, внутренние капитальные стены, перекрытия междуэтажные, крыша, проемы дверные – металлические. Полы – бетонированные, металлические. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная.
6. Здание ЗРУ-10 кВ КЦ-3 с инв. №122/С-2247. Назначение – здание нежилое. Год постройки – 1983. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 448,7 м²/389,9 м². Фундамент – бетон. Наружные, внутренние капитальные стены – кирпич с ж/б каркасом. Перегородки – кирпич. Перекрытия чердачные – ж/б плита. Крыша – совмещенная. Полы – бетонные. Проемы оконные – деревянный блок. Проемы дверные – простые. Внутренняя отделка – оштукатурено, побелено. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная.
7. Здание КНС КЦ-3 с инв. №122/С-2245. Назначение – здание нежилое. Год постройки – 1982. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 10 м²/20,8 кв.м. Фундамент – бетон. Наружные, внутренние капитальные стены, перегородки, крыша, полы, проемы дверные – металлические. Внутренняя отделка – окрашено. Электроснабжение – открытая проводка. Водопровод, канализация – центральные. Вентиляция – принудительная.
8. Сооружения: - система грозозащиты КЦ -3 с инв. №122/С-15277, назначение – сооружение специализированное энергетики, высота – 26 м; - канализационная насосная станция КЦ-3, инв. № 6124; - внутриплощадочные проезды КЦ-3, инв. №6128; - ограждение КЦ-3, инв. № 6130.
9. Передаточные устройства: - внутриплощадочные электросети КЦ-3 с инв. №122/С-15271, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность – 557 м; - внутриплощадочные теплосети с инв. №122/С-15270, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 329,9 м; - внутриплощадочные водопроводные сети КЦ-3 с инв. №122/С-15273; назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения; протяженность – 1624,2 м; - внутриплощадочные сети канализации КЦ-3 с инв. №122/С-15275, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 302,3 м; - кабельные линии от ЗРУ 10 кВ к электроприемникам КЦ-3 с инв. № 122/С-15267, назначение - сооружение специализированное энергетики, протяженность – 525 м.
10. Оборудование: - КНТП промплощадки КЦ-3, инв. №6115; - мостовой кран машзала электрический КЦ-3, инв. №6110; - тельфер электрический машзала КЦ-3, инв. №6111; - кран мостовой ручной КЦ-3, инв. №6112; - таль ручная червячная КЦ-3, инв. №6113; - радиоканальная система передачи извещений «Маяк» КЦ-3, инв. №7210.
11. Многолетние насаждения: - яблоня – 89 штук.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 3,1410 га с кадастровым номером 123400000001000151. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания компрессорной станции «Ивацевичи» (компрессорный цех №3). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,8% (ноль целых восьми десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 23.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос.регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр.лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»,* **проводимом 23 июня 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **19.06.2014 в 12.00.**

**Заключительная регистрация участников 23.06.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Качан Мария Васильевна 8 (044) 716-01-32.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

Сямейная газета

Выпуск № 7 (11)

■ Партрэт у інтэр'еры

# МОЦНАЯ СЯМ'Я БЕЗ АБМЕЖАВАНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**Дом для мяне — гэта нешта надзейнае і ўтульнае. Прыходжу ў госці і адразу адчуваю атмасферу: у адным доме — напружанне, у другім — радасць, у трэцім — абыякавасць…**
**У сям'і Аляксандра СУБОТЫ, прызёра Паралімпіяды-2012, і яго маладой жонкі адчувалася невялікае хваляванне. Іх дом — гэта маленькі пакойчык ў кватэры бацькоў Сашы. Аня да майго прыходу спякла смачны торт. Было відаць, што для яе гаспадарыць — справа натуральная. Калі мы расселіся, я разгледзела сямейную пару. Абодва — маладыя і прыгожыя, часам пераглядваюцца, жадаючы падтрымаць адно аднаго. За паўтары гадзіны мы здолелі пагаварыць пра ўсё: спорт, каханне, сям'ю, дзяцей і пра тое, што такое быць чалавекам з абмежаванымі магчымасцямі…**



— Я яшчэ ў дзяцінстве выбраў спорт,— адразу пачаў расказваць сваю гісторыю Аляксандр.— Мне было гадоў дванаццаць, і ў маім асяроддзі было сорамна не наведваць якую-небудзь секцыю. Часцей за ўсё я чуў ад сваіх сяброў і братоў, што яны «ідуць на трэніроўку». Прыгожае словазлучэнне. Мне таксама хацелася «хадзіць на трэніроўку». А тут якраз да нас у школу прыйшоў трэнер па веславанні і стаў набіраць групу… Я запісаўся.

Калі дома расказаў бацькам аб сваім намеры, маці трохі занепакоілася: маўляў, у першую чаргу — вучоба. Але тата з ёю пагаварыў, і яна згадзілася.

Калі ж рыхтаваўся да паступлення ў каледж трэнер Тамара Шыманская запрасіла мяне ў паралімпійскі спорт. Я тады вельмі разгубіўся… Ніколі не лічыў сябе чалавекам з абмежаванымі магчымасцямі. Нават памятаю гэтую няёмкасць ад таго, што мне прапанавалі *спорт для інвалідаў*. Але мяне запэўнілі, што магу стаць спартсменам міжнароднага класа, і я згадзіўся. Пачаў займацца лыжамі і лёгкай атлетыкай. Так пазнаваў сябе. Хацелася даведацца, да чаго маю здольнасці…

Зімой прыходзілася ездзіць па пяць кіламетраў на лыжах у мароз. Даволі хутка зразумеў, што лыжы — не маё. Я цеплалюбівы! А вось лёгкая атлетыка адразу спадабалася, і я пачаў спрабаваць сябе ў розных відах. І толькі з 2002 года стаў займацца скачкамі. Дзякуючы трэнерам Віктару Бельскаму, Анатолю Майструку і працы з імі ў 2012 годзе стаў бронзавым прызёрам у трайным скачку на Паралімпіядзе ў Лондане.

**— Ці ўдалося табе скончыць каледж?**

— Так, я там атрымаў тэхнічную адукацыю. Яшчэ маю і спартыўную. Калі скончыў Універсітэт фізічнай культуры і спорту, то адразу ўладкаваўся на працу трэнерам. Цяпер я працую ў дзіцячай спартыўнай школе «Юнацтва» трэнерам па лёгкай атлетыцы. Спачатку працаваў на «голым» акладзе. За 720 тысяч трэніраваў дваццаць дзяцей. Але, нягледзячы на такі невялікі заробак, рабіў гэта з задавальненнем. Вельмі люблю сваю працу і сваіх дзяцей.

**— З сучаснымі дзецьмі не так проста знайсці кантакт…**

— Мы з імі адразу пасябравалі. Спачатку было лягчэй з дзяўчынкамі, бо яны больш арганізаваныя і слухаюць уважлівей. А хлопчыкам абы толькі куляцца ды залезці куды-небудзь. Аднак дзяўчынкі з часам пачынаюць «качаць правы» і крыўдзіцца з-за нечага (больш, вядома, з-за недахопу ўвагі). Напэўна, у іх раней пачынаецца пераходны ўзрост. А хлопцы, наадварот, становяцца больш паслухмянымі і дысцыплінаванымі.

Быць трэнерам — вельмі адказна. Мой характар шмат у чым сфарміраваўся пад уплывам першага трэнера па веславанні Юрыя Асмалоўскага.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***



## АД ПРАДЗЕДАЎ, СПАКОН ВЯКОЎ...

**«Мама, а наша прабабуля, калі маленькая была, дыназаўраў бачыла?»**

*(з дзіцячага фальклору)*

Шчыра кажучы, я не ведаю сваіх прадзедаў. І прабабуль таксама. Прабабуля Надзея, бацькава бабуля, не дажыла да майго нараджэння ўсяго якіх паўгода, прадзеда Сяргея я таксама не заспела на гэтым свеце. Бабуля Ніна памерла яшчэ крыху раней, дзядуля ж Анатоль, які жыў асобна, быў для нас гэткім аналагам «нядзельнага таты» — «канікулярным дзедам», з якім мы бачыліся толькі летам, дый тое нядоўга. Праўда, шматлікіх стрыечных дзядзькаў і братоў я добра ведаю і кантактую з імі стараюся не страчваць. Таму і даведалася, напрыклад, што дзядзька Саша, які жыве ў паўночнай сталіцы Расіі, пачаў рабіць радавод і знайшоў звесткі прыкладна да 1860 года.

З «лініяй» мамы справы ў мяне таксама не лепшым чынам. Імёны прабабкі Веры і народнага мамінага дзеда Паўла, якія жылі ў Валгаградзе, а таксама прабабкі Нюры — яна была з казацкай станіцы недзе ў шолахаўскіх мясцінах, таксама пад Валгаградам, — для мяне так і засталіся толькі подпісамі на адваротным баку выцвілых, пажаўцелых чорна-белых фотакартак.

Чамусьці толькі ў дарослым узросце зразумела, наколькі гэта важна. Шкадую, што ў дзяцінстве, мякка кажучы, наўважліва, з пятага на дзясятае, слухала расповеды бацькоў і старэйшых сваякоў пра мінулыя часы. Робіцца сорамна за тое, што мне, гарадской дзяўчынцы, было няўтульна і няёмка «ў гасцях» у сваякоў на Брэстчыне і Гомельшчыне, і я з большай ахвотай збягала з малымі на вуліцу, чым сядзела з дарослымі. Чырванею, узгадваючы, што падчас самастойных студэнцкіх адпачынкаў у Крыме рэдка заходзіла да бабулі Розы і дзеда Валодзі. А цяпер і папрасіць прабачэння няма ў каго...

Магчыма, таму мы стараемся, каб дачушка часцей бачылася з дзядулем і бабулямі па абедзвюх лініях. У ідэале, вядома, хочацца, каб мы ўсе збіраліся не толькі за святочным сталом у кампаніі тэлевізара, але і сустракаліся проста так — гулялі, працавалі, чыталі, абмяркоўвалі навіны, жартавалі, спрачаліся. Каб вучыліся і пераймалі: адны — бязмежны аптымізм, другія — цярпенне. У рэшце рэшт, каб кветачкі-дзеці ведалі і разумелі, што яны не самі па сабе, што ёсць моцныя і трывалыя карані і што яны пайшлі не ад малпы і Адама, а ад сваіх бацькоў, дзедаў, прадзедаў і прапрадзедаў. І няхай жыццё імклівае, а ідэал амаль недасяжны, але хто сказаў, што да яго не трэба імкнуцца?

А вы ведаеце, як звалі вашых прабабуль?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ У вас будзе дзіця

«ЗВЯЗДА» + АНТ

## ЛЕРА

Трэці год на тэлеканале АНТ існуе рубрыка «У вас будзе дзіця». Кожны тыдзень беларускім гледачам расійскай праграмы «Пакуль усе дома» паказваюць сюжэты пра дзяцей, якія чакаюць усынаўлення. Дзякуючы праграме свае новыя сем'і знайшлі 45 дзяцей. Да праекта далучылася і наша газета.

**Лерачцы — 2,4 года. Яна жыве ў Віцебскім доме дзіцяці. У такім узросце дзеці звычайна не любяць апранацца: нервуюцца, плачуць, але Лера — выключэнне, яна спакойна сама надзявае панчошкі, шапачку, сандалікі. Для Леры гэта як гульня. У дзяўчынкі добрая памяць — яна ведае, як завуць усіх дзяцей у групе.**

Наталля КАРАТЫЦЫНА, выхавацель:

— Валерыя — дзяўчынка вельмі эмацыянальная, рухавая, «хахатунчык». Любіць гуляць з лялькамі, укладваць іх спаць, карміць, расчэсваць.



Сама вельмі любіць упрыгожвацца. Калі ёй даеш цацку, то гэта будзе толькі яе цацка; нават калі Лера яе недзе пакінула, яна абавязкова будзе трымаць цацку ў полі зроку, і ніхто не павінен гэтую рэч браць.

Лера вельмі прывязваецца да людзей, давярае ім. Калі штосьці выбірае, то назаўжды. Ёй патрэбна частая змена відаў дзейнасці, і, вядома, ёй патрэбны актыўныя бацькі.

## ВІКА І ВАЛЕРА



**10-гадовая Віка і яе малодшы брат Валера з Гродзенскага дзіцячага дома — мілыя і пазітыўныя. Яны любяць разам маляваць, вышываць і збіраць канструктар LEGO. Сястра і брат чакаюць маму і тату, якія падораць ім цеплыню, клопат і пяшчоту.**

Ганна БЕЛАЕЦ, педагог-псіхолаг:

— Валера і Віка вельмі мілыя, пазітыўныя і кантактныя. Валеру жартам называюць малым прафесарам: ён вельмі засяроджаны, сур'ёзны, у школе любіць больш за ўсё матэматыку. Віка — натура адкрытая, рамантычная. Любіць беларускую літаратуру, урокі працы, спяваць і танцаваць.

Каб даведацца больш пра гэтых дзяцей, пазваніце па нумары (8017) 2847151. Гэта тэлефон Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПАЧАЦЬ ЛЕТА СА СВЯТА

У Дзень абароны дзяцей, выйдзе спецыяльны святочны выпуск праграмы «У вас будзе дзіця». Прычым, як адзначаюць супрацоўнікі тэлеканала АНТ, для іх гэта двайная нагода для радасці: дзіцячае свята і юбілейны выпуск.

Госцем праграмы стане вядомы тэле- і радыёвядучы, артыст Дзядзька Ваня, які распавядзе пра сваё ўласнае бацькаўскае шчасце — маленькую дачку Міраславу, і пра тое, ці насамрэч з нараджэннем дзіцяці светаўспрыманне і свядомасць бацькоў перакульваецца з ног на галаву.

Вядучая рубрыкі Людміла Бусько ў гэты дзень распавядзе гледачам не адну, а цэлых 5 гісторый дзяцей, якім вельмі патрэбны сапраўдная сям'я і новы ўтульны дом...

# ЯК СТВАРАЕЦЦА ЦУД,

## або Узняцца пасля падзення

**Нядаўна праваслаўны Цэнтр рэабілітацыі залежных ад алкаголю і наркотыкаў «Анастасіс» адзначыў сваё трохгоддзе. Цэнтр так назвалі невыпадкова. У перакладзе з грэчаскай «Анастасіс» азначае «ўваскрэсенне». Тыя, хто пакутуе ад алкагалізму і наркаманіі, спадзяюцца, што іх душа адродзіцца, жыццё зменіцца, а тут, у цэнтры, іх ніхто не асудзіць і наадварот, дапамогуць пераадолець хваробу. Гэты шлях пераадолеў і сам дырэктар цэнтра Віталь ПАШКЕВІЧ *(на фота)*. Некалі ён пакутаваў ад залежнасці, а сёння дапамагае пазбавіцца ад яе. Цэнтр створаны ў 2011 годзе па благаславенні архіепіскапа Навагрудскага і Лідскага Гурыя. У 2012 годзе рашэннем Святога сінода БПЦ «Анастасісу» прысвоілі статус «Цэнтр рэабілітацыі Беларускага Экзархата».**



— Пачыналася ўсё з пошуку будынка. Памяшканне, якое мы маглі сабе дазволіць, не эксплуатавалася некалькі гадоў, таму гэта быў халодны будынак, у якім працавала толькі адна разетка, — узгадвае дырэктар. — Першы залежны, які прасіўся ў цэнтр на рэабілітацыю, убачыўшы ўмовы, раптам перадумаў… Астатнія тры засталіся і дзякуючы рабочай разетцы змаглі нават павячэраць.

Але нягледзячы на ўсе складанасці, цэнтр пачаў сваю работу. Сваімі рукамі рэабілітанты зрабілі рамонт, і сёння мы адначасова можам прыняць каля дваццаці чалавек. За гэтыя гады ў нас прайшлі рэабілітацыю 136 чалавек.

**— Хворыя да вас самі прыязджаюць ці іх прывозяць родныя?**

— Калі залежны не хоча лячыцца, калі на рэабілітацыі настойвае маці ці іншы блізкі чалавек, у такіх выпадках лячэнне не дапамажа. Мы не бяром адказнасць за чужое жыццё. Спецыялісты згубяць час на працу, якая не прынясе нікому карысці. Хворыя на алкагалізм ці наркаманію самі павінны захацець пазбавіцца ад залежнасці. Калі ў чалавека няма матыву і жадання, то мы яму дапамагчы не зможам.

**— Ці можна матываваць залежнага?**

— Так, напрыклад, нашы апошнія чатыры рэабілітанты былі матываваны за паўгадзіны. Я сам быў залежны і таму навучыўся падбіраць неабходныя словы, якія чапляюць такіх хворых. Насамрэч залежныя глыбока ў сабе адчуваюць, што яны хворыя. Проста ім патрэбна дапамагчы гэта прызнаць, убачыць сябе і сваю будучыню…

**Праз некалькі тыдняў рэабілітацыі жанчыны мяняюцца вельмі выразна, пачынаюць сачыць за сабой, у іх з'яўляецца пачуццё ўласнай годнасці, што адбіваецца і на паводзінах.**

**— Пасля таго, як чалавек згадзіўся на лячэнне, як вы далей працуеце з імі?**

— Хачу адразу адзначыць: мы не лечым! Бо алкагалізм і наркаманія — невылечныя захворванні, якія прагрэсуюць. Рэабілітацыя мае на ўвазе навучанне жыццю без ужывання алкаголю ці наркотыкаў.

У нашым цэнтры дзень рэабілітантаў распісаны амаль па хвілінах. А сёмай гадзіне раніцы — пад'ём. Ужо праз пятнаццаць хвілін пачынаецца ранішняя малітва. Пасля — прыбіранне пакояў і сняданак. Потым — першы ўрок. Мы зачытваем цытату са «Старонак цвярозасці» ці Евангелля. Кожны павінен выказаць сваё меркаванне — так людзі вучацца прыслухоўвацца да сябе, аналізаваць. Калі ўрок скончаны, то ўсе ідуць працаваць. А палове першай залежныя зноў збіраюцца і падводзяць вынікі.

Рэабілітанты сочаць за сабой падчас працы: што адчувалі (напрыклад, раздражненне, жаданне выпіць, прыняць наркотыкі) і што рабілі з гэтымі пачуццямі. Спецыяліст вучыць іх на самым пачатку зараджэння думкі аб спіртным ці наркотыках адганяць яе. Так залежныя вывучаюць самі сябе. Пасля перакур (курыць у цэнтры не забаронена) і час на падрыхтоўку дамашняга задання.

Пасля абеду з імі пачынае працу псіхатэрапеўт, нарколаг і святар. На занятках рэабілітанты праходзяць праграму «12 крокаў». Адзін з першых і галоўных крокаў для хворага — прызнаць, што ён залежны і бяссільны перад наркотыкамі і алкаголем. Калі чалавек шчыра прызнае, што ён алкаголік ці наркаман, што ён хворы, то гэта ўжо 50% поспеху. Часта чалавек галавой разумее, што праблема ёсць, а ўнутры ўсё працівіцца. Патрэбна поўнае прызнанне.

Пасля заняткаў — вячэра і перапынак. У восем збіраецца група самадапамогі. Тэму задаюць самі рэабілітанты. У дзевяць гадзін падводзім вынікі. Кожны расказвае, як прайшоў яго дзень, як змагаўся і што пераадолеў.

Дзень заканчваецца вячэрняй малітвай. Па суботах рэабілітанты ходзяць у лазню, глядзяць фільмы ці чытаюць кнігі, але толькі тэматычныя. Тэлефоны, інтэрнэт і ўласная літаратура — пад забаронай. У нядзелю раніцай едзем у храм.

**— Родныя наведваюць?**

— Першы месяц наведванні забаронены. Гэты час самы цяжкі для рэабілітантаў, ім не патрэбны лішнія спакусы. Лепш для іх сфакусіравацца на барацьбе з залежнасцю. Усяго рэабілітацыя доўжыцца каля 90 дзён. Некаторыя нават пасля першага месяца лічаць, што перамаглі залежнасць, аднак мы не рэкамендуем пакідаць цэнтр. Ён не закрыты, і прымусова ніхто нікога не трымае, аднак выхад за тэрыторыю цэнтра забаронены. Гэтая адказнасць на самых рэабілітантах. У нас за ўвесь час быў толькі адзін выпадак, калі залежны пакінуў тэрыторыю і выпіў. Гэта грубае парушэнне, за якое назад у цэнтр ужо не прымаем. Іншыя, наадварот, пасля трохмесячнай рэабілітацыі хочуць застацца яшчэ на нейкі час. Мы прапануем такім людзям папрацаваць пры манастыры.

**Алкагалізм і наркаманія — невылечныя захворванні, якія прагрэсуюць. Рэабілітацыя мае на ўвазе навучанне жыццю без ужывання алкаголю ці наркотыкаў.**

У іншым падобным цэнтры, у якім я працаваў, рэабілітацыя доўжылася паўгода. Пасля гэтага рэабілітантам прапанавалася пажыць у камуне, недалёка ад цэнтра. З імі жыў толькі адзін кансультант. Аднак рашэнні па гаспадарцы і забеспячэнні прымалі самі залежныя. Дык вось, тыя, хто праходзіў сацыяльную адаптацыю ў камуне, жылі цвяроза і без зрываў. Нешта падобнае мы арганізавалі і тут. Пасля рэабілітацыі чалавек едзе дадому на тры дні і потым ужо, калі захоча, вяртаецца жыць пры манастыры і там працаваць. Сёння такіх пяць чалавек.

**— Якія людзі часцей за ўсё аказваюцца ў вашым цэнтры?**



На святкаванні юбілею ўдзельнікі атрымалі памятныя сувеніры і медалі.

— Самыя розныя па ўзросце і па статусе. Самы малады ў нас быў васямнаццацігадовы хлопец. Самы стары — 57-гадовы мужчына. Мы не звяртаем увагі на матэрыяльнае становішча. Галоўнае, каб сам залежны быў згодны з нашымі ўмовамі. На маёй памяці быў выпадак, калі чалавек хацеў праходзіць рэабілітацыю ў нас, але пры ўмове, што ён будзе карыстацца мабільным тэлефонам. Мы яму адмовілі. Як гаворыцца, у чужы манастыр са сваімі правіламі не лезуць. Тым больш, у любым падобным цэнтры забаронена сувязь з навакольным светам.

**«Халява» для залежных вельмі небяспечная. Патрэбна, каб яны ведалі, што іх лячэнне мае сваю цану.**

Цяпер праходзіць рэабілітацыю адна жанчына. Увогуле, за ўвесь час у нас жылі толькі тры жанчыны, але гэта былі выключныя выпадкі. Справа ў тым, што пакуль няма магчымасці стварыць дастойныя ўмовы для жанчын. Для іх патрэбна пабудаваць асобны корпус ці хаця б выдзеліць паверх.

**— Што гэта за выключныя выпадкі?**

— Жанчыне, якая праходзіць у нас рэабілітацыю, усяго 32 гады, у яе чацвёра дзяцей. Дзяцей забралі пакуль у прытулак. Мне пазваніла сацыяльны работнік са школы і папрасіла дапамагчы. Жанчына знаходзіцца ў асобным пакоі: паводле нашых правілаў, мужчыну забаронена заходзіць у пакой жанчыны, а жанчыне — у пакой мужчыны. Пакуль усё нармальна…

У жанчын ёсць адна дзіўная асаблівасць: калі яна залежная, то гэта вельмі прыкметна па знешнасці. Але праз некалькі тыдняў рэабілітацыі жанчыны мяняюцца вельмі выразна, пачынаюць сачыць за сабой, у іх з'яўляецца пачуццё ўласнай годнасці, што адбіваецца і на паводзінах. Таму каханне ў цэнтры (у выпадках, калі з'яўляецца жанчына) не пазбегнуць, асабліва рэабілітантам, якія толькі пачынаюць заўважаць навакольле, нібыта прачынаюцца.

**Калі чалавек шчыра прызнае, што ён алкаголік ці наркаман, што ён хворы, то гэта ўжо 50% поспеху.**

Што добра, бо гэта — жывыя пачуцці, з якімі патрэбна працаваць і вучыцца жыць. Таму я спадзяюся, што ў наступным годзе мы вырашым пытанне з корпусам і для жанчын.

**— Вы сказалі, што працуеце не бясплатна. Але звычайна залежныя не зарабляюць. Дзе ім узяць грошы на рэабілітацыю?**

— Калі чалавек хоча вылечыцца, але ў яго няма грошай на рэабілітацыю і блізкія не могуць дапамагчы, то мы разам шукаем варыянты. Так, напрыклад, да нас вельмі прасіўся мужчына з Ліды. У яго была матывацыя і шчыры настрой, а грошай не было. Пасля рэабілітацыі ён уладкаваўся на працу і на працягу пяці месяцаў вярнуў грошы.

Хачу падкрэсліць, што «халява» для залежных вельмі небяспечная. Патрэбна, каб яны ведалі, што іх лячэнне мае сваю цану.

**— Ці бывалі ў вашым цэнтры цуды?**

— Для сваякоў залежных цуд ужо тое, што іх родныя пачынаюць барацьбу. Аднак я бачу цуд пераўтварэння і адраджэння людзей амаль кожны дзень.

Некалькі месяцаў таму да нас прыехаў былы зняволены мужчына, якому 44 гады. Гэта сапраўдны рэцыдывіст, які сядзеў каля 25 гадоў. Іншымі словамі, выходзіў, выпіваў — і зноў у турму. І так яго жыццё з юнацтва. Здавалася, што яго нішто не зможа змяніць. Ён паступіў да нас адразу пасля інсульту, хадзіў толькі з кійчкам (амаль поўзаў). Уявіце, гэты чалавек, у адрозненне ад іншых, з першага дня перастаў брыдкасловіць. У нас такая мова забаронена, але многім не адразу даецца цяжкая навука — гаварыць нармальна. Мужчына, увесь сіні ад татуіровак, з моцнай залежнасцю, нейкім цудам не сарваўся і прыняў рэжым нашага цэнтра. Больш за тое, цяпер ён ходзіць без кійчка, і высвятлілася, што ў яго на дзіва залатыя рукі. Ён даглядае гаспадарку ў цэнтры.

**— Як святкавалі дзень нараджэння цэнтра?**

— Правілі Дзень адкрытых дзвярэй. У свяце брала ўдзел каля 60 чалавек. Прыехалі выпускнікі і іх родныя, прадстаўнікі суполкі «Ананімныя алкаголікі», госці з Гродзенскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя — наркалогія». Мы напісалі гімн і распрацавалі сцяг. Цяпер у нашага цэнтра ёсць свой твар. Пасадзілі яблыневы сад — Сад цвярозасці. Цяпер кожны выпускнік зможа выбраць сабе дрэва і даглядаць яго, каб ён час ад часу. А ў дагледжанага дрэва добрыя плады. ***Але галоўны плён працы над сабой у рэабілітантаў — жыццё без залежнасці.***

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

---

■ Спартсмены — дзецям

# «НАШЫ ВЫХАВАНЦЫ АЛІМПІЙЦАЎ ПАБАЧЫЛІ ЎПЕРШЫНЮ»

**На Брэстчыне праходзіць дабрачынная акцыя «Алімпійцы — дзецям». Знакамітыя спартсмены, удзельнікі алімпійскіх гульняў розных гадоў едуць у госці да выхаванцаў дзіцячых дамоў і інтэрнатаў, праводзяць там спартыўныя мерапрыемствы, расказваюць аб дасягненнях беларускага спорту, праводзяць цёплыя сустрэчы і гутаркі з дзецьмі, уручаюць падарункі.**

Кіраўнік прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў Брэсцкай вобласці Алена Белаконенка паведаміла, што ідэя наведаць усе ўстановы вобласці, дзе жывуць і выхоўваюцца дзеці-сіроты, нарадзілася пасля ўдалага выступлення нашай алімпійскай зборнай у Сочы. Расказаць дзецям пра нашы алімпійскія медалі, пра спартыўныя перамогі краіны, пра карысць ад заняткаў фізкультурай і спортам вырашылі цікава, весела, з элементамі гульні. У кожнай са школ найперш праводзілася спартландыя. У розных узроставых групах ладзілі віктарыны па веданні беларускіх спартсменаў і дасягненняў айчыннага спорту. Дзеці праяўлялі актыўнасць і цікавасць.

Паводле слоў **намесніка дырэктара Жабінкаўскай спецыялізаванай школы-інтэрната Тамары ТАЎРЭЛЬ,** да іх завіталі майстар спорту міжнароднага класа па акадэмічным веславанні Ірына Базілеўская, майстар спорту міжнароднага класа па кулявой стральбе Яўгенія Галуза, алімпійскі чэмпіён Сяргей Макаранка. «Нашы дзеці былі ў захапленні, — гаварыла Тамара Аляксандраўна. — Раней яны ніколі не бачылі спартсменаў такога ўзроўню, тым больш алімпійскіх чэмпіёнаў, што называецца, ужывую. Дзеячы беларускага спорту праводзілі гутаркі ў кожным класе, адказвалі на пытанні, цікавіліся справамі дзяцей. Потым госці паўдзельнічалі ў спартландыі, уручылі прызы пераможцам, а школе падарылі такі неабходны нам спартыўны інвентар».



Не толькі ў Жабінцы, але і ў Быцені Івацэвіцкага раёна, Пінску, Малоткавічах Іванаўскага раёна, Ганцавічах, Кобрыне адзначалі, што мерапрыемствы вельмі зацікавілі дзяцей. У дзіцячыя ўстановы нярэдка прыходзяць наведвальнікі. Часцей за ўсё гэта прадстаўнікі прадпрыемстваў-шэфаў, пастаянныя валанцёры з ліку студэнтаў, а вось прафесійныя спартсмены тут, як аказалася, вельмі рэдкія госці. Таму яны аказаліся надзвычай жаданымі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ** ■

■ Школьнікі выбіраюць

# ЦЯХЦІНСКІЯ МІРАТВОРЦЫ

**Пакуль Цяхцінскі дзіцячы сад-школа Бялыніцкага раёна — адзіная на Магілёўшчыне навучальная ўстанова, якая далучылася да міжнароднага праекта «Сетка школ міру».**

Наогул рух юных міратворцаў пачаў развівацца ў канцы 90-х гадоў у Маскве. Яго дзейнасць грунтуецца на захаванні духоўна-патрыятычных традыцый. А ідэю стварэння падтрымала супольнасць арганізацый сістэмы ААН. Адным з кірункаў яго працы і стала з'яўленне ў 2001 годзе праекта «Сетка школ міру». Ён аб'ядноўвае тыя ўстановы, дзе ёсць дзіцячы актыў, які займаецца рашэннем сацыяльных і міратворчых задач. Вядома, з дапамогай школьных кіраўнікоў.

— Мы ўключыліся ў гэты праект у верасні мінулага года,— кажа **настаўніца беларускай мовы і літаратуры Лілія ШАКУРА.**— Ветэраны занепакоены, што моладзь мала цікавіцца міратворчай палітыкай. А гэты праект дае магчымасць паўплываць на сітуацыю. Дзеці хочуць ведаць, як жывуць іх равеснікі ў іншых краінах, чым займаюцца. Мы вывучылі міратворчыя напрамкі, па якіх працуе праект, і прыйшлі да высновы: гэта тое, што нам трэба.

Пачаць вырашана было з дзкады добрых спраў, падчас якой настаўнікі разам са сваімі выхаванцамі займаліся зборам і падрыхтоўкай падарункаў для дзяцей з сацыяльнага прытулку, інвалідаў, малазабяспечаных сем'яў. Яны разам клеілі пакецікі з рознакаляровай паперы, складвалі туды цацкі, канцылярскія прылады, сшыткі. Па выніках дзкады падрыхтавалі справаздачу і накіравалі ў Маскву. Яна мела поспех, школа атрымала Пасведчанне прызнання добраахвотнай міратворчай дзейнасці.

З таго часу колькасць акцый толькі павялічваецца. «Вось тут сабрана ўся інфармацыя пра нашы справы,— дэманструе **завуч школы Наталля КРАМКОВА** тоўстую папку з фотаздымкамі і падрабязным апісаннем.— Тое, што ўсё робіцца рукамі падлеткаў, вельмі важна. Яны разумеюць, што робяць карысную справу. Як і іх аднагодкі за мяжой.



Міхаіл КУРНОСАЎ — актыўны ўдзельнік міратворчых акцый.

Расійскія куратары праекта прапанавалі знайсці сярод сваіх землякоў прафесійных міратворцаў. А хутка стала вядома, што на Магілёўшчыне медалямі міратворцаў былі ўзнагароджаны дзве жанчыны. У гады вайны яны выратавалі яўрэйскага хлопчыка. Калі пачалася вайна, ён знаходзіўся ў бабулі ў вёсцы. І калі б не мужнасць тых жанчын, загінуў бы падчас карных аперацый фашыстаў. Выратаваны хлопчык стаў ваенным. Ён адшукаў гэтых жанчын, каб асабіста падзякаваць ім за выратаванае жыццё.

Цяпер школьнікі шмат чаго робяць для таго, каб захаваць памяць аб сваіх земляках, якія змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

— Непадалёк ад Цяхціна, у Асмолаўскім лесе, знаходзіцца зямлянка, якую мы восенню рэстаўравалі,— кажа Лілія Фёдараўна.— Лясніцтва дапамагло нам з драўнінай. Вось збіраемся тэрыторыю агарадзіць.

— Мы гэтую зямлянку бадай усю сваімі рукамі перабралі. Здавалася, што на нейкі час перанесліся ў тыя гады. Гэта былі невыказныя адчуванні! — падзяліўся ўражаннямі **вучань 9 класа Міхаіл КУРНОСАЎ.**

Дарэчы, школа носіць імя камандзіра партызанскага атрада № 121 Асмана Касаева. Кожны год яго землякі з Карачаева-Чаркесіі наведваюць школу, каб разам з яе настаўнікамі і вучнямі аддаць даніну памяці гераічнаму сыну свайго народа.

— Летась яны пажадалі сустрэцца з тымі людзьмі, якія бачылі Асмана Касаева,— кажа Лілія Фёдараўна.— Цяпер тым відавочцам па 80 гадоў. Яны ўспаміналі, які гэта быў баявы чалавек.

У хуткім часе маскоўскія куратары будуць вызначаць, ці заслугоўвае гэта навучальная ўстанова права лічыцца «школай міру». Ёй вельмі хацелася б захаваць гэты статус.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара**

■ Наш фармат

## САМІ З МЕДАЛЯМІ

**Ордэны Маці атрымалі з рук старшыні Мінгарвыканкама Мікалая Ладуцькі яшчэ 4 жыхаркі сталіцы, якія нарадзілі і выхоўваюць па пяць і больш дзяцей. Акрамя таго, падзякі гарадскіх улад, кветкі і падарункі дасталіся яшчэ тром шматдзетным маці за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і фарміраванне станоўчага іміджу сям'і.**

Усяго ж у Мінску 471 жанчына ўжо мае гэту высокую ўзнагароду, у тым ліку 40 мінчанак атрымалі яе летась. У дадатак да ордэна кожная з гэтых шматдзетных сем'яў атрымлівае з гарадскога бюджэту матэрыяльную дапамогу.

Дарэчы, летась у сталіцы нарадзіліся 22863 немаўляты — гэта на 226 больш, чым у 2012-м. Амаль на 18% вырасла колькасць сем'яў, дзе выхоўваюць траіх і больш дзяцей.

**Кацярына МАРОЗАВА.**

## ТЫЯ, ХТО «ЗА»

У сталіцы назвалі пераможцаў конкурсу сацыяльных тэхналогій у абарону сямейных каштоўнасцяў «За жыццё»

**Арганізатарамі конкурсу, накіраванага на ўмацаванне інстытуту сям'і і фарміраванне ў моладзі пазітыўных сямейных каштоўнасцяў, выступілі Мінгарвыканкам, Мінская епархія Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама міжнародны дабрачынны фонд «Сям'я — Яднанне — Айчына» і аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.**

Прадстаўленыя праекты — а на адрас аргкамітэта паступіла больш чым 90 заявак — ацэньваліся па 10 намінацыях: «Навука», «Сведчанне» (праца са СМІ і сацыяльная рэклама), «Асвета», «Дапамога», «Акушэрства і гінекалогія», «Абарона», «Творчасць», «Уклад», «Узаемадзеянне», «Спорт».

Гран-пры дастаўся адразу некалькім удзельнікам: педагагічнаму калектыву Мінскага дзяржаўнага каледжа электронікі, кіраўніцтву Палаца дзяцей і моладзі «Арыён», а таксама адміністрацыі псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў № 3 г. Мінска за праект «Брацтва Чырвонага клёна» (сацыяльнае суправаджэнне ўразлівых груп і наладжванне ўзаемадапамогі) і калектыву 4-й жаночай кансультацыі 1-й гарадской клінічнай бальніцы за праект «Інфармацыйная дзейнасць па прафілактыцы абортаў, перадабортнае кансультаванне». Лаўрэаты конкурсу «За жыццё» былі адзначаны дыпломамі і каштоўнымі прызамі.

«Іскры таленту, ініцыятывы, нестандартнага падыходу да тэмы былі ўласцівы ўсім дасланым работам,— адзначыў **старшыня аргкамітэта рэспубліканскай духоўна-асветніцкай праграмы і праўлення фонду «Сям'я — Яднанне — Айчына» Уладзімір ГРОЗАЎ.**— Конкурс абяцае стаць традыцыйным».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

■ Кропка адліку

# НА ШТО ТОЙ КЛАД, КАЛІ Ў СЯМ'І ЛАД…

**Аб неабходнасці стварэння асаблівага асяроддзя для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, гаварылі за «круглым сталом» «Сямейныя каштоўнасці ў сучаснай інфармацыйнай прасторы», які прайшоў у Доме праваслаўнай кнігі. Удзельнікамі мерапрыемства сталі вядомыя беларускія вучоныя, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы і СМІ.**

— У сучасным грамадстве патрэбна стварыць спрыяльныя ўмовы для сем'яў з дзецьмі,— лічыць **кіраўнік Цэнтра па абароне мацярынства і сямейных каштоўнасцяў БПЦ, іерэй Дзмітрый ГРЫЦЭНКА.**— Сёння нават у дзіцячых парках адпачынку, побач з атракцыёнамі стаяць піўныя і алкагольныя бары. Таму ў такіх парках мы бачым і нецвярозых дарослых. Многія не задаволены гэтым. Узнікае патрэбнасць стварыць месцы адпачынку, дзе няма бараў і піўных. Гэта спадабалася б многім сем'ям.

Калі ў краіне будзе фарміравацца пэўная атмасфера і асяроддзе, тады і грамадства стане больш арыентаваным на маральныя каштоўнасці. Прадстаўнік царквы падкрэсліў, што ў гэтым працэсе немалаважную ролю адыгрываюць СМІ.

— Нас вучылі, што журналіст павінен быць бессdroнім, што патрэбна даваць людзям безацэначную інфармацыю,— сказаў **Алег ЛЕПЕШАНКОЎ, тэлежурналіст, прадзюсар беларускай версіі праекта «У вас будзе дзіця», выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ.**— Але я лічу, што журналістыка не можа быць безацэначнай. Людзям патрэбны маральныя каштоўнасці, каб ведаць, што норма існуе. І асаблівую ўвагу сёння важна надаваць сям'і, бо гэта тое месца, дзе фарміруецца чалавек, дзе ён атрымлівае асновы жыцця і тыя каштоўнасці, якімі будзе карыстацца ў будучыні. Вядома, што толькі 15% выпускнікоў дзіцячых дамоў удаецца сацыялізавацца ў грамадстве. Чаму толькі пятнаццаць? Таму што ў гэтых дзяцей няма перад вачыма таго вобраза, па якім яны б маглі будаваць сваё жыццё. Але ў такой сітуацыі цяпер аказваюцца і дзеці, і дарослыя. Па тэлевізары і ў інтэрнэце журналісты часта не задаюць тую самую неабходную норму для людзей. А чалавек без разумення нормы, без духоўнага стрыжня — ненадзейны і безадказны. Таму калі мы накіраваны не на разбурэнне, а на стварэнне здаровага грамадства, то неабходна прытрымлівацца традыцыйных каштоўнасцяў і гуманнасці.

> **Чалавек без разумення нормы, без духоўнага стрыжня — ненадзейны і безадказны.**

Тым больш, што ў беларусаў былі і ёсць свае сямейныя традыцыі. Праўда, пра іх мала хто гаворыць, іх мала хто прытрымліваецца, заўважыла **доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Ірына КАЛАЧОВА.**

— Сёння навукоўцам ёсць што сказаць моладзі і студэнтам аб беларускіх сем'ях і традыцыях выхавання ў Беларусі,— сказала гісторык.— Праўда, такое спалучэнне, як «народная педагогіка» і «народная традыцыя выхавання», ужо амаль знікла з нашага лексікону. У разуменні большасці гэта нешта мінулае, забытае і непатрэбнае ў імклівым XXI стагоддзі. Беларусы — цудоўны народ, мудры. Нашы продкі здолелі назапасіць і зрабіць у галіне педагогікі шмат карыснага, але… На жаль, няма ў беларусаў гонару за чалавека, які з'яўляецца галоўным вынікам нашай традыцыі, галоўнай спадчынай нашай культуры. Гаворым аб беларусах неяк апасродкавана, нават нясмела. А вось іншыя народы, асабліва малыя — наадварот, шукаюць сваю апору ў мінулым, у народнай традыцыі. Традыцыйная педагогіка ў беларускіх сем'ях — гэта цалкам зразумелая, выверaная сістэма прадпісанняў, пісаных і няпісаных правілаў, гэта нібыта матрыца сямейных традыцый выхавання. Тут і самаадданасць бацькоў, і разуменне бацькамі свайго статусу, і павага да сям'і і сямейных каштоўнасцяў. Нездарма ў Беларусі заўсёды казалі: «На што той клад, калі ў сям'і лад…».

Прафесар дадала, што ў беларусаў ёсць здабыткі, аб іх проста патрэбна пачаць гаварыць, «выцягнуць на свята» традыцыйнае і нацыянальнае, прамаўляць і інтэрпрэтаваць у сучасным кантэксце.

Таксама на мерапрыемстве абмяркоўваліся такія тэмы, як змена адносін да шматдзетных сем'яў, роля СМІ ў павышэнні статусу моцнай сям'і, фарміраванне грамадскай думкі аб значэнні сямейных каштоўнасцяў, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ**

# А нараджаць лепш у Беларусі…

**У сусветным рэйтынгу «World Mother's Index 2014», які штогод складае па выніках маштабнага даследавання дабрачынная арганізацыя Save the Cildren, наша краіна аказалася на 26-м месцы, гэтак жа, як і Вялікабрытанія. Беларусь па сукупнасці спрыяльных умоў для мацярынства ўступіла, напрыклад, Эстоніі, Чэхіі і Літве, затое абышла Японію (32-і радок рэйтынгу), Польшчу (29-ы), Ізраіль (28-ы), а таксама ўсе краіны СНД (Расія ў агульным заліку — на 62-м месцы, Казахстан — на 63-м, Арменія — на 95-м, Узбекістан — на 111-м, а Украіна, якая нядаўна выйшла са складу СНД,— на 72-м).**



Лідарамі ў спісе найлепшых для мацярынства краін сталі Фінляндыя (трымае пальму першынства другі год запар), Нарвегія, Швецыя, Ісландыя і Нідэрланды, а замыкаюць рэйтынг Нігер, Конга і Самалі. На інтэрактыўнай карце свету, складзенай па выніках даследавання, відаць, што найбольш спрыяльнымі для маці і дзяцей аказаліся краіны Паўночнай Еўропы, а горш за ўсё сітуацыя складалася ў шэрагу краін Афрыкі. Усяго ж эксперты міжнароднай супольнасці, якая займаецца абаронай правоў дзяцей па ўсім свеце, прааналізавалі звесткі па 178 краінах.

Сярод асноўных крытэрыяў, паводле якіх складаўся рэйтынг, улічваліся звесткі, атрыманыя Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, напрыклад, паказчыкі смяротнасці парадзіх і дзяцей у раннім узросце, узровень адукаванасці маці і іх палітычны статус (суадносіны колькасці жанчын і мужчын у заканадаўчых органах улады), а таксама даступнасць для іх адукацыі. Напрыклад, ЗША, якія яшчэ 15 гадоў таму ўваходзілі ў топ-5, сёлета займаюць толькі 31-ю пазіцыю са 178. Амерыканскія жанчыны, як адзначаецца ў справаздачы, сутыкаюцца з не меншымі рызыкамі мацярынскай смяротнасці, што і жыхаркі Ірана ці Румыніі. А вось Беларусь прасунулася наперад: летась у рэйтынгу наша краіна была 24-й, але і колькасць краін, дзе праводзілася даследаванне, была меншай — 165.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

■ Спрэчны момант

## ВЫПУСКНЫЯ Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ: ПРАВОДЗІНЫ ДЗЯЦІНСТВА

**Руслан СТАРЫКОЎСКІ, дырэктар гурта «J:Морс», тата дзвюх дачок:**

— На ўласным прыкладзе магу даць параду ўсім, хто аддае дачку ці сына ў дзіцячы садок: уважліва глядзіце, каго вы выбіраеце ў бацькоўскі камітэт! Часта большасці бацькоў на гэты момант пляваць, бо ўсе занятыя працай, домам і іншымі справамі, але ў выніку можа аказацца, што «да ўлады» прыйдуць людзі з абсалютнай адсутнасцю густу, і вынік будзе жахлівым.

Я сёлета ўжо ваяваў з нашым бацькоўскім камітэтам за выпускны альбом, бо ангажаваны імі фатограф зрабіў нейкую нізкаякасную пошасць. Прапанаваў іншы варыянт, куды лепшай якасці, прычым цана пытання была ўсяго плюс дзесяць тысяч рублёў... Але нават тыя, каму мая ідэя спадабалася, вырашылі не ісці супраць большасці, бо баяліся, што гэта можа адбіцца на стаўленні да дзіцяці. Цяпер жа **я канчаткова пасварыўся з бацькоўскім камітэтам, які арганізуе выпускны вечар для 6-гадовых дзяцей у самы пік фінальных баёў па хакеі — 24 мая, прычым у сталічным клубе (!), дзе «кругаварот» п'яных балельшчыкаў,** казіно на першым паверсе і, прабачце, дзяўчаты лёгкіх паводзін у гасцініцы па суседстве. Я ў шоку ад гэтай вакханаліі. Спрабаваў знайсці кампраміс, каб правесці выпускны пасля завяршэння ЧС па хакеі, але дамовіцца так і не ўдалося... Яшчэ каля 10 чалавек адмовіліся ад удзелу ў такім выпускным, і мы пойдзем асобна — ці ў дзіцячы забаўляльны цэнтр, ці хоць бы ў «McDonal'd's», дзе ёсць дзіцячыя забаўляльныя праграмы.

Я не супраць правядзення выпускных у дзіцячым садку — наадварот, толькі вітаю, каб было такое сентыментальнае свята развітання з дзяцінствам, каб засталася памяць у выглядзе фотаальбома і відэа, на якім дзеткі, апранутыя ў прыгожыя касцюмы, разам спяваюць і чытаюць вершы, сядзяць за салодкім сталом, танцуюць, смяюцца. Але яно павінна праходзіць найперш для саміх дзяцей, а не задавальняць амбіцыі бацькоў. Асноўная праблема — у нас саміх. Вельмі сумна, калі дарослыя людзі пра гэта забываюць і часта забываюць нават проста па-чалавечы аддзячыць тым, хто 4—5 гадоў даглядаў, песціў і выхоўваў нашых дзяцей. Што да мяне, то я шчыра ўдзячны і цудоўнай, інтэлігентнай загадчыцы, якая вельмі шмат зрабіла для нашага дзіцячага садка, пачынаючы ад арганізацыі гурткоў і да сістэмы харчавання, і вартаўніку-інваліду, які даглядае і трымае ў ідэальнай чысціні і парадку тэрыторыю...




**Юлія БЫКАВА, спявачка, маці сына-дашкольніка:**

— Мы наведваем не дзіцячы садок, а падрыхтоўчую групу пры школе, і я якраз нядаўна патэлефанавала дырэктару, каб даведацца, у якім фармаце будзе праходзіць выпускны ў нашай групе. На шчасце, ён плануецца так, як мне і хацелася: у актавай зале будзе канцэртная праграма для бацькоў, дзеці парадуюць нас песнямі, вершыкамі, танцамі, якія яны вывучылі; потым прапануюць зрабіць салодкі стол, прычым ні пра якія дадатковыя грашовыя ўнёскі нават гаворкі не было. Але, думаю, мы з іншымі бацькамі дамовімся, каб аддзячыць педагогам, падарыць ім кветкі — прынамсі мне падабаецца, як там даглядаюць нашых дзетак і як з імі працуюць. Дык чаму не выказаць за гэта падзяку?

Ад некаторых знаёмых чула, што ў іх дзяцей будуць выпускныя ў забаўляльных цэнтрах, ведаеце, дзе ёсць гульнявыя зоны, атракцыёны, лабірынты і ўсё астатняе. Гэты варыянт, шчыра кажучы, мне падабаецца значна менш: у падобных цэнтрах стаіць шум, вэрхал, мітусня, і сама нагода, з якой збяруцца дзеці і бацькі, у такой атмасферы зводзіцца да нуля. Да таго ж у такіх цэнтрах прадаюцца чыпсы, газіроўка і іншыя шкодныя, але прывабныя для малых рэчы, так што давядзецца змагацца з бясконцымі «мама, хачу тое і гэта»... Але **найгоршае месца для правядзення дзіцячых свят, да якога я, як маці, стаўлюся вельмі негатыўна, — гэта разнастайныя начныя клубы.** У адным з іх мы з мужам пэўны час таму працавалі, і я дагэтуль памятаю цьмянае, змрочнае і пракуранае памяшканне, якое немагчыма праветрыць, жахлівыя торты ў дзіцячым меню... Калі ўжо ёсць грошы і магчымасці, то лепш арганізаваць для сваіх «выпускнікоў» выезд на прыроду, замовіць забаўляльную праграму ў якой-небудзь загараднай кавярні ці сядзібе.

# «ІСТЭРЫК У ПАЛІКЛІНІЦЫ Ў НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ НЕ ЗДАРАЛАСЯ»

**Пераможцаў гарадскога конкурсу на лепшую шматдзетную сям'ю 2014 года Уладзіміра і Аксану ТАРАСІКАЎ, якія жывуць у Маскоўскім раёне сталіцы, я такімі і ўяўляла: маладыя, актыўныя, згуртаваныя і мэтанакіраваныя. А дзеці — 8-гадовая Сафія, 5-гадовая Ева і малодшы, 3-гадовы Сава — дружалюбныя, творчыя, гарэзлівыя і часам непаслухмяныя.**



Уладзімір — супрацоўнік Дэпартамента аховы МУС, Аксана працуе медсястрой у абласным раддоме і ў адным са сталічных медцэнтраў. Здавалася б, дзе маглі перасячыся прадстаўнікі такіх розных прафесій? Аказваецца, на сесіі ў Акадэміі МУС, дзе будучы муж атрымліваў профільную адукацыю, а будучая жонка вывучала юрыдычную псіхалогію. Потым маладая сям'я прайшла загартоўку жыццём у інтэрнаце, сумяшчэннем вучобы і выхавання дзіцяці, таму прывыклі разлічваць толькі на ўласныя сілы. І кожнае наступнае дзіця ў Тарасікаў з'яўлялася не таму, што «так атрымалася», а таму, што бацькі свядома былі да гэтага гатовы.

— Ніякай спантаннасці і нечаканасцяў у гэтым пытанні не было. Мы загадзя планавалі дзетак і разлічвалі сілы, — расказвае Аксана. — Тым больш, у мяне ўжо быў вопыт: працуючы медсястрой, ведала, як правільна карміць немаўлят, мыць, ранкі апрацоўваць... Толькі цяжкавата было спалучаць здачу сесій і груднoе кармленне. Але ў нас памочнікаў хапала: мая мама, цётка, сястра Вовы, усе нашы родныя. Дый сам Валодзя заўжды, дзе мог, мяне падмяняў — малых купаў, спаць укладваў, на вучобу мяне адпускаў без пытанняў. Акадэмічны водпуск вырашылі не браць, бо распачатую справу трэба завяршыць, а не пакінуць вісець цяжкім каменем на душы. На выпускны вечар у ВНУ прыйшла, памятаю, у гожай сукенцы, з макіяжам... і з вялікім жыватом, бо ўжо чакала нараджэння другой дачкі.

### Усё па плане

«С чувством, з толком, с расстановкой» — гэты ж падыход бацькі паспяхова прымяняюць у выхаванні і развіцці дзяцей. А гэта, на думку Аксаны і Уладзіміра, значыць не толькі атрымліваць новыя веды дома, у садку і школе, але і даць малым магчымасць паспрабаваць сябе ва ўсіх кірунках, каб высветліць, да чаго больш ляжыць душа. Цяпер другакласніца гімназіі №12 Сафія займаецца ў музычнай школе, Ева захапляецца мастацкай гімнастыкай, Сава наведвае спартыўную секцыю «Маўглі».

**Мама мне некалі сказала: «Нарадзіўшы, забудзься пра сябе — цяпер не будзе «я», толькі «мы».**

Дзякуючы маме Аксане малодшыя Тарасікі дакладна ведаюць, што такое культура гігіены — у гэтай сям'і ніколі не гучыць пытанне, навошта трэба мыць рукі або чысціць зубы. А яшчэ Аксана ведае, як навучыць дзяцей правільна паводзіць сябе ў паліклініцы:

— Не трэба палохаць малых дактарамі, каб не мець у будучым праблем. Мы з Сафіяй, напрыклад, перад паходам да стаматолага бралі з сабой нейкі падарунак, які ўрач пасля агляду ўручаў за цярпенне і добры догляд зубоў. А каб малыя не баяліся здаваць аналізы, спачатку прайгравалі сітуацыю дома, у форме гульні з лялькамі: і «праслухоўвалі», і «кроў» бралі, і нават «кропельніцы» ставілі. Я заўжды старалася патлумачыць, што і з якой мэтай робяць урачы. Слёзы, натуральна, усё адно былі, хоць і карысталіся спецыяльнымі, менш балючымі іголкамі, але істэрык у паліклініцы ні ў кога з маіх дзяцей не здаралася. Наогул, медыцынскія веды па жыцці нам вельмі дапамагаюць.

### Карані і галінкі

«А паказаць вам, як я ўмею садзіцца на шпагат?» — пакуль тата расказвае пра паходжанне расстаўленых у дзіцячым пакоі грамат і дыпломаў, Ева таксама стараецца прыцягнуць увагу. Дачакаўшыся згоды, дэманструе выдатную гнуткасць і радасную ўсмешку, а потым зноў збягае гуляць з братам у «дамашні хакей». Малы ж, які, да слова, быў адным з галоўных «складнікаў» перамогі ў сямейным конкурсе, носіцца па кватэры, як маленькі верталёт.

— Гэта тры зусім розныя характары, — ласкава ўсміхаецца мама Аксана на просьбу расказаць больш пра дзяцей. — Усе трое добрыя, спагадлівыя, любяць жывёл. Праўда, дадому яшчэ нікога не прыносілі, але, думаю, гэта пытанне часу. Сафія актыўная, вельмі кантактная, праяўляе сябе ў розных кірунках — і ў спорце, і ў творчасці, і ў вучобе. Ева больш уседлівая. Яна, напрыклад, захапляецца бісерапляценнем, можа доўга вымалёўваць прыгожыя літаркі. У стасунках з людзьмі больш асцярожная, але калі пасябруе па-сапраўднаму, то гэта надоўга. Сава вельмі ўпарты, і, калі яму нешта не даспадобы, давядзецца доўга ўгаворваць. А яшчэ ён лідар па характары, вельмі любіць быць у калектыве і згуртоўваць іншых дзяцей вакол сябе.

На сваім фамільным гербе — яго, дарэчы, давялося прадстаўляць на конкурсе «Лепшая шматдзетная сям'я» — Тарасікі намалявалі дрэва з магутнымі каранямі, дом, поўны дзяцей, і бусла ў небе. Да слова, уласнае «сямейнае дрэва» Аксана ведае на некалькі пакаленняў у глыбіню: «Сваякі адшукалі згадкі, што мой пра-пра-прадзядуля на пачатку XIX стагоддзя быў выпісаны панам у маёнтак у якасці ветэрынарнага ўрача. Але па маёй лініі ў нас больш педагогаў, чым урачоў. А яшчэ я выпадкова даведалася пра тое, што ў родзе маёй бабулі ўжо быў Сава, так што, атрымліваецца, імя нашага сына — спадчыннае. Наогул, я лічу, гэта вельмі важна — ведаць, кім былі твае продкі, чым яны займаліся, адкуль пайшло прозвішча, і расказваць пра гэта ўжо сваім дзецям. Бо ўсё, з чым чалавек уваходзіць у жыццё, пачынаецца з сям'і».

### Пачуццё локця

Перадусім, мяркуюць шматдзетныя бацькі, у дзецях трэба закласці пачуццё любові — да мамы з татам і адно да аднаго, каб яны заўжды трымаліся разам: «Калі ты ведаеш, што цябе заўжды выслухаюць і падтрымаюць, то самымі важнымі людзьмі для цябе будуць усё ж бацькі, браты і сёстры, а не вулічныя сябры».

У сям'і Тарасікаў такія традыцыі: перад зыходам на працу бацькі і дзеці жадаюць адно аднаму добрага дня, а ўвечары, калі атрымліваецца сабрацца за вячэрай усім разам, абмяркоўваюць, у каго як гэты дзень прайшоў. Яны разам пішуць лісты Дзеду Марозу і плануюць адпачынак, удзельнічаюць у спартландыях і ходзяць на Вялікдзень у царкву... І на што патраціць выйграны ў конкурсе «Лепшая шматдзетная сям'я года» грашовы прыз, таксама вырашылі ўсе разам — натуральна, на дзяцей! Дакладней, на падрыхтоўку да школы — форму, рукзакі, канцтавары і г.д.

А пра сам конкурс яны захоўваюць самыя цёплыя ўспаміны. «Якая канкурэнцыя? Што вы! — смяюцца Уладзімір і Аксана. — Было адчуванне вялізнай сям'і. Нам падалося, наогул у шматдзетных сем'ях «пачуццё локця» больш развіта, бо кожны на ўласным вопыце ведае, што гэта такое — мноства дзяцей».

— Што значыць «шчаслівая сям'я»? — задумліва перапытвае Аксана. — Узаемаразуменне і павага інтарэсаў, уменне выслухаць кожнага. Абавязкова агульная мэта — быць разам і даць дзецям усё самае лепшае. І яшчэ, безумоўна, пастаянная праца. Мама мне некалі сказала: «Нарадзіўшы, забудзься пра сябе — цяпер не будзе «я», толькі «мы».

— Таксама, мяркую, шчаслівая сям'я — тая, у якой дзеці ці бацькі прыходзяць дадому і могуць распавесці, што ў іх адбылося і што накіпела за дзень, каб зняць гэты стрэс, а не выплёскваць яго на блізкіх, — дадае Уладзімір.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара.**

# КАРТА СВЕТУ Ў ПАРТРЭТАХ

**Нямецкі фатограф Уве Омер, які з юнацтва жыве і працуе ў Парыжы, на працягу 4 гадоў калясіў па свеце на ўласным аўто са складным экранам і партатыўнай фотастудыяй, затое без тэлефона, GPS-навігатара і нават гадзінніка. Усё для таго, каб захаваць на фота самыя розныя сем'і. Пабываў ён, дарэчы, і ў Беларусі, а таксама зазірнуў да нашых суседзяў — у Расію і ва Украіну. А яшчэ ездзіў па Літве, Эстоніі, Албаніі, Казахстане, Замбіі, Эрытрэі, ПАР, Аўстраліі, Эквадоры, Нікарагуа, Кітаі, Іарданіі...**

Вынікам працяглага падарожжа стаў фотаальбом «1000 сем'яў». Дакладней, у гэтай унікальнай калекцыі сабраны 1251 здымак са 131 краіны — з каментарыямі аўтара пра кожную сустрэтую ім сям'ю. У 2000 годзе прайшла выстава «1000 сем'яў», а пасля было выдадзена некалькі кніг, куды ў дадатак да здымкаў увайшлі інтэрв'ю з сем'ямі.

«Ідэя праекта «1000 сем'яў», задуманага яшчэ ў 1990-я, заключалася ў тым, каб паказаць: хоць мы ўсе на выгляд і па ладзе жыцця вельмі адрозніваемся (адзеннем, колерам скуры, рэлігіяй, традыцыямі), але, па сутнасці, у аснове сваёй, усё роўна аднолькавыя», — тлумачыць фатограф. Здымкі Омера — «сямейны альбом планеты» — наглядна паказваюць, што, нягледзячы на ўсе нацыянальныя, культурныя, геаграфічныя і іншыя адрозненні, сям'я застаецца адным з найбольш значных і ўніверсальных інстытутаў для ўсяго чалавецтва.

Уве ўжо больш за 70 гадоў, але век не адбіваецца на актыўнасці і нястомнасці фатографа. Зрабіўшы сабе імя на здымках для рэкламы і індустрыі моды, ён любіць эпатаваць публіку — напрыклад, эратычнай фотасесіяй з удзелам вядомых палітыкаў і акцёраў. Акрамя таго, ён выдаў цэлых шэсць зборнікаў, прысвечаных жаночай прыгажосці і розніцы ў яе ўспрыманні (адзін, напрыклад, прысвечаны цемнаскурым лэдзі). З 2010 года ва ўжо ўпадабаным фармаце Омер рэалізуе новы, яшчэ больш маштабны праект — «Падлеткі ў коле сям'і», для чаго запланаваў аб'ехаць 40 краін Еўропы. У гэтым годзе выставы «тынейджарскага» праекта пройдуць у Германіі, Францыі і Грэцыі.

«З таго часу, як я прысвяціў усяго сябе глабальным фотапраектам, сумаваць мне не даводзіцца, — кажа аўтар. — Яны паўплывалі і працягваюць уплываць на маё жыццё самым непасрэдным чынам. Я нават ажаніўся ў Лас-Вегасе, калі працаваў над сваім праектам...»


Мінск, ліпень 1998. Сям'я Калеснікава распавяла фатографу, што любіць французскую мову і штогод арганізуе сустрэчы студэнтаў з Францыі і Беларусі.


Албанія, снежань 1996. У гэтай сям'і ёсць 50 авечак, свой дом і невялікі бізнес — вытворчасць масла, сыру і ёгурту.

# МОЦНАЯ СЯМ'Я...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Дарэчы, ён ніколі не даваў мне «спуску» і патрабаваў ад мяне таго ж самага, што і ад астатніх, здаровых, дзяцей. Я і цяпер лічу сябе звычайным, здаровым чалавекам. Так, у мяне ёсць праблема з рукой, у мяне правабаковы параліч, але гэта ніяк не ўплывае на мае магчымасці.

***— А як у сям'і ставіліся да тваёй «адметнасці»?***

— Мяне ніколі не выхоўвалі як чалавека з «асаблівасцямі». Вырас у шматдзетнай сям'і з двума братамі. Напэўна, з усіх трох я быў самы хуліганісты. Самы старэйшы з нас заўсёды быў і самы актыўны. Ён займаўся ў розных секцыях: ад каратэ да бальных танцаў. Мы, меншыя, глядзелі на яго і таксама рухаліся ў бок самаўдасканалення.

**У маі нам патрэбна павіншаваць з днём нараджэння ажно пяць чалавек. І гэта толькі блізкіх сваякоў. А ў нас яшчэ і сяброў шмат.**

Бацькі ніколі не былі з намі строгімі. Тата патрабаваў толькі адказнасці ў часе: калі сказаў, што будзеш дома ў восем, значыць, так і павінна быць. І за гэта яму вялікі «дзякуй», бо ў мяне і сёння прывычка сачыць за часам. Гэта вельмі дысцыплінуе.

Маці некаторы час перажывала, што я захапіўся спортам. Але супакоілася, калі скончыў каледж.

Любыя дасягненні ў маім жыцці заўсёды падтрымліваліся ўсімі роднымі. Увогуле, усё маё асяроддзе: сябры, браты, родныя і трэнеры — ніколі да мяне не ставіліся «асабліва».



Браты Суботы (на фота знізу) і «клан» Ані.





Падчас трэніроўкі.

Напэўна, калі дзіця выхоўваць як чалавека з абмежаванымі магчымасцямі, то ў будучыні яму будзе цяжка прыстасавацца, паверыць у сябе і дасягаць мэты.

— Мне здаецца, шкадаванне — пачуццё непрыемнае, — падліваючы гарбату ў кубак, — далучаецца да размовы Аня.— Мая сям'я ніколі не ставілася да Сашы па-асабліваму. На дачы ён і дровы коле, і ямы капае....

— Ага, — смяецца Аляксандр. — Я падазраю, што твой тата ўсё ж ставіцца да мяне асабліва! Чаму тады двум іншым зяцям работа лягчэй адводзіцца?

— Ты проста самы малады! — са смехам пярэчыць Аня.— Ведаеце, калі мы з ім сталі сустракацца, я нават не заўважыла, што ў яго праблема з рукой. Праз месяц, калі Саша намаляваў мой партрэт, мама сказала мне: маўляў, які Саша малайчына — з адной рукой і так шмат дасягнуў. Я тады вельмі здзівілася: чаму з адной? І толькі пасля гэтай размовы стала прыглядацца. Мае адносіны, і праўда, змяніліся : стала адчуваць гонар за майго Сашу.

***— Як вы пазнаёміліся?***

— Ён быў сведкам на вяселлі маёй сястры. Калі Саша ўвайшоў у нашу кватэру, я адразу ўсё зразумела. Так, з першага погляду! Калі б ён адразу паклікаў замуж, то згадзілася б. На другі дзень ён падсеў да мяне. А потым, мы ўсю ноч аб нечым гаварылі на лавачцы. Мне было лёгка з ім гаварыць на любыя тэмы. Здавалася, што мы даўно ўжо ведаем адно аднаго.

— Пасля таго вяселля мы тыдзень перапісваліся па інтэрнэце, — працягвае Аляксандр.— А потым я запрасіў яе на спатканне. Сталі сустракацца, а праз два гады пабраліся шлюбам.

***— Лічыцца, што маладой сям'і лепш жыць асобна ад бацькоў...***

— Нас пужалі, што дзве гаспадыні на кухні не могуць паладзіць, — паціснула плячыма Аня. — Але я не адчула ніякага дыскамфорту. Я думаю, што ў нас так склалася таму, што ў свекрыві вялікі жыццёвы вопыт. Да таго ж мы адразу сталі жыць як асобная сям'я.

***— Вы заглядаеце ў будучыню?***

— Спадзяёмся, што ў нас будзе сваё жыллё, — адказвае Саша. — Мы кожны месяц патроху адкладваем грошы на кватэру. Разумеем, што без крэдыту не здолеем пабудаваць, але ўсё роўна стараемся сабраць максімальную суму.

— Саша вельмі адказна ставіцца да сямейнага бюджэту, — падхоплівае Аня.— Я некалькі дзён таму ўладкавалася на працу, так што хутка змагу дапамагчы мужу.

***— А дзяцей пакуль не плануеце?***

— Плануем, — разам адказалі маладыя.

— Хочацца вялікую сям'ю,— прызнаецца Аня.— Каб у нас было як мінімум чатыры ці пяць дзяцей.

— І я, і Аня выраслі ў шматдзетных сем'ях, — тлумачыць Аляксандр. — У нас склаліся добрыя і блізкія адносіны з нашымі братамі і сёстрамі, ды ўвогуле з усімі роднымі. Мы падтрымліваем адно аднаго, і нам разам ніколі не сумна. Калі ў сям'і шмат дзяцей, тады і святы шумныя, і заўсёды ёсць аб чым гаварыць.

***— За паўтара года сумеснага жыцця ў вас сфарміраваліся сямейныя традыцыі?***

— Напэўна, пакуль не, — разгубілася Аня. — Яны проста не паспяваюць фарміравацца. У нашых сем'ях кожны месяц свята, і таму мы часта сустракаемся з роднымі. Гэта адметнасць нашай сям'і. Уявіце, толькі ў маі нам патрэбна павіншаваць з днём нараджэння ажно пяць чалавек. І гэта толькі блізкіх сваякоў. А ў нас яшчэ і сяброў шмат.

**Напэўна, калі дзіця выхоўваць як чалавека з абмежаванымі магчымасцямі, то ў будучыні яму будзе цяжка прыстасавацца, паверыць у сябе і дасягаць мэты.**

— Так, Аня мае рацыю, — падтрымлівае жонку Аляксандр. — Мы адной сям'ёй сабрацца не можам, бо нас занадта многа. Таму Новы год, Раство, Вялікдзень святкуем па чарзе: адзін год у «клане» маёй жонкі, другі — у маім. Жаданне мець вялікую сям'ю ў нашым выпадку — гэта спадчыннае. У майго бацькі трое дзяцей, у дзеда — пяць! Спадзяюся, што мы з Анютай здолеем прадоўжыць традыцыю.

***— Што галоўнае вы зразумелі падчас сямейнага жыцця?***

— Мы навучыліся жыць побач, — кажа Аня. — У нас на дваіх маленькі пакой, няшмат прасторы. У нашай сям'і быў адзін уклад, у сям'і Сашы — іншы. Пакуль прывыкалі адно да аднаго, то, бывала, і сварыліся. Але ўсё роўна было больш добрага і прыемнага...

***— А калі сварыліся, хто першы ішоў мірыцца?***

— Па чарзе, — смяецца Аня. — На самой справе, першы ідзе той, хто менш пакрыўджаны.

— І Аня ўпэўнена, што гэта я. Проста я больш ураўнаважаны. Яна больш эмацыянальная. Але так і павінна быць, бо яна — жанчына.

— З ім увогуле нецікава сварыцца. Ён амаль заўсёды маўчыць...

***— Каб сям'я была моцнай, патрэбна...***

— Каханне і ўзаемаразуменне, — упэўнены Саша.

— Калі ёсць каханне, а няма ўзаемаразумення, то і сям'і не будзе, — дадае Аня. — Хутка «разбягуцца».

— У нас ідэальнае спалучэнне, — глядзіць на Аню з пяшчотай Аляксандр. — І каханне, і ўзаемаразуменне.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота з архіва сям'і.**

■ Мы — каманда!

# ЯК БАБУЛІ З УНУКАМІ ІНТЭРНЭТ ПАКАРЫЛІ

**Амаль 30 пар вачэй напружана глядзяць у камп'ютарныя маніторы, а пальцы з лёгкай няўпэўненасцю націскаюць на клавішы. Заданні трэба выканаць не толькі як мага хутчэй, але яшчэ і якасна... Гэта не алімпіяда па інфарматыцы і не спаборніцтвы геймераў — так выглядаў «Сямейны марафон», які сабраў разам бабуль з дзядулямі і іх унукаў.**

Ідэю гэтага незвычайнага праекта прапанавалі студэнты факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Васіль Корф і Іван Жодзік. Маладыя людзі справядліва вырашылі, што добра было б, каб сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі не павялічвалі разрыў паміж рознымі пакаленнямі, а, наадварот, аб'ядноўвалі бацькоў і дзяцей у сумесным спасціжэнні новага. У 2011 годзе ў Беларусі адбылася першыя спаборніцтвы па камп'ютарнай граматнасці «Сямейны марафон. Web 60», удзельнікамі якога сталі сямейныя каманды з двух чалавек: бабуля ці дзядуля (старэйшыя за 55 гадоў) з унукам або ўнучкай.

Сёлетні марафон, зладжаны Фондам ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Беларускай асацыяцыяй сацыяльных работнікаў пры падтрымцы сотавага аператара МТС, сабраў 14 каманд і груп падтрымкі. Самаму старэйшаму з удзельнікаў праекта нядаўна споўнілася 76 гадоў, а наймаладзейшаму — усяго 6. Пажылым людзям трэба было самастойна выканаць некалькі заданняў: ствараць электронную паштовую скрыню, знайсці патрэбную інфармацыю праз пошукавую сістэму, а таксама дабавіць уласны матэрыял на адзін з парталаў навін і завесці ўліковы запіс (акаўнт) у сацыяльнай сетцы. Унукам дазвалялася толькі падказваць і даваць парады, як лепш вырашыць тую ці іншую задачу. Тым жа, чые ўнукі не змаглі паўдзельнічаць у марафоне з-за занятасці, кампанію склалі юныя валанцёры. Некаторыя ўдзельнікі аказаліся настолькі актыўнымі і разумнымі вучнямі, што паспелі за адведзены час знайсці і забраніраваць электронныя білеты на канцэрты любімых выканаўцаў, а самыя кантактныя далучалі новых сяброў у сацыяльных сетках. Каманды-пераможцы «марафонцаў» Адэль Васільеўны Каняшовай, Ліліі Давыдаўны Салаўёвай і Елізаветы Іванаўны Сінілавай, атрымалі каштоўныя падарункі ад арганізатараў і партнёраў праекта.

**Многія прызналіся, што калі раней лічылі камп'ютары і інтэрнэт выключна захапленнем маладых, то цяпер адкрылі для сябе мноства цікавага і зразумелі, што з выхадам на пенсію актыўны ўдзел у сацыяльным і прафесійным жыцці не канчаецца.**



Фота www.belapan.com.

«Мэта марафону — гэта, перш за ўсё, узаемасувязь пакаленняў, — падкрэсліла **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю ЮНФПА ў Беларусі Вольга ГЕРАСЕНКА**. — Мы хацелі, каб бабулі, дзядулі і ўнукі маглі знайсці агульную мову, разумелі адно аднаго і паспрабавалі праявіць гэтае паразуменне падчас праекта». Многія з «марафонцаў» прызналіся, што калі раней лічылі камп'ютары і інтэрнэт выключна захапленнем маладых, то цяпер адкрылі для сябе мноства цікавага і зразумелі, што з выхадам на пенсію актыўны ўдзел у сацыяльным і прафесійным жыцці не канчаецца і пры жаданні можна заўжды заставацца на сувязі з калегамі, сябрамі, дзецьмі і ўнукамі, нават калі тыя жывуць у іншым горадзе ці краіне.

**Кацярына МАРОЗАВА** ■

■ Дыягназ — не прысуд

# 820 ДЗЯЦЕЙ ПАСЛЯ ЭКА

## нарадзіліся ў краіне летась

**Беларусь уваходзіць у топ-50 краін, спрыяльных для мацярынства. Даследчыкі ўлічваюць пры вызначэнні гэтага паказчыка пяць асноўных фактараў: рызыку мацярынскай смяротнасці, валавы нацыянальны даход, узровень адукацыі жанчын, смяротнасць дзяцей ва ўзросце да 5 гадоў, а таксама ўдзел жанчын у палітычным жыцці краіны.**

Мацярынская смяротнасць — а гэта выпадкі гібелі жанчын падчас цяжарнасці і родаў — з 2010 года заставалася на ўзроўні аднаго выпадку ў год, удакладняе **галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Святлана САРОКА.** Летась жа наогул не было зарэгістравана ніводнага падобнага выпадку. З 2000 года каэфіцыент дзіцячай смяротнасці таксама стабільна зніжаўся і цяпер знаходзіцца на ўзроўні 3–4%. Разам з тым, агульны стан здароўя маладых беларускіх жанчын пакідае чакаць лепшага. У больш як 70% жанчын цяжарнасць працякае з ускладненнямі. А гэта ў далейшым яшчэ больш пагаршае здароўе маці і, відома, адбіваецца на здароўі дзяцей.

**У нашай краіне прадастаўляецца заканадаўчая магчымасць правядзення экстракарпаральнага апладнення.**

15% шлюбных пар выстаўляецца сёння дыягназ бясплоднасці. На 100 тысяч насельніцтва рэгіструецца 148 выпадкаў жаночай і 24 выпадкі мужчынскай бясплоднасці. У шэрагу выпадкаў прымяненне розных спосабаў лячэння жаночай і мужчынскай бясплоднасці прыносіць свой плён, а таму падобны дыягназ — не прысуд.

Закон «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях» прадастаўляе заканадаўчую магчымасць правядзення экстракарпаральнага апладнення ў нашай краіне. За тры гады толькі дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя выканалі 2552 цыклы ЭКА (плюс — 1568 інсемінацый спермай донара... ) — ЭКА (плюс — 1568 інсемінацый сперматазоідамі). Камерцыйныя медустановы выканалі за той жа час 5715 цыклаў ЭКА (плюс — 605 інсемінацый).



Цяжарнасць наступіла амаль у 40% выпадкаў, што з'яўляецца досыць добрым вынікам. Цяжарныя назіраюцца далей у дзяржаўных жаночых кансультацыях і нараджаюць, адпаведна, у дзяржаўных радзільных дамах. Летась зарэгістравана 820 родаў пасля ЭКА, праведзенага як у дзяржаўных, так і камерцыйных медустановах (у адзінкавых выпадках — за мяжой). Фактычна ў кожным трэцім выпадку гэта былі шматплодныя роды.

✓ **Прыкладна 1% ад усіх родаў складаюць роды шматплодныя. Галоўным чынам, гэта двойні, у 2% выпадкаў — тройні.**

✓ **Сярэдні ўзрост маці пры нараджэнні першага дзіцяці — 25 гадоў.**

✓ **Доля дзяцей, народжаных у матуль, якія жывуць па-за шлюбам, знізілася з 24% у 2005 годзе да 16% у 2013-м.**

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Псіхалогія для ўсіх

# ПРЫВЫКАЕМ ДА РОЛЯЎ МАМЫ-ТАТЫ

**Ці гатовы я да таго, каб мець дзіця? Ці стану я добрым бацькам? Ці буду я ведаць, што рабіць у розных сітуацыях? Такія пытанні хвалююць усіх, і не варта баяцца падзяліцца сваімі пачуццямі з навакольнымі. Не бойцеся высвятляць тое, што хвалюе. Дзяліцца сваімі думкамі трэба і са сваім партнёрам — каб падтрымліваць агульны аптымістычны погляд на жыццё.**

— Калі кожны член сям'і прыслухаецца да такой парады, гэта гарантуе ўсім добрае самаадчуванне і магчымасць падрыхтавацца да папаўнення, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Іна ЦЕЛЕШ.** — Плануйце сеансы ўльтрагукавога даследавання і наведванне гінеколага так, каб абое маглі прысутнічаць на прыёме, палюбуйцеся на яшчэ не народжанае дзіця! Загадзя падрыхтуйце пытанні, якія хочаце задаць урачу. Наведвайце разам заняткі па дародавай падрыхтоўцы. Няхай працэс родаў стане зразумелым для абаіх. Гэта пазбавіць лішніх страхаў.

Добра падтрымліваць кантакты з тымі, хто таксама рыхтуецца стаць бацькамі або ў каго нядаўна нарадзілася дзіця. Гэта дапаможа многаму навучыцца.

Кантактуйце і са сваімі бацькамі. Будучыя бабулі і дзядулі могуць таксама падтрымаць, развеяць беспадстаўныя страхі, дапамагчы з пакупкамі.

Калі вы працуеце, неабходна абмеркаваць тэрмін адсутнасці на працы і час вяртання. Ці можаце вы браць работу на дом? Ці плануеце пасля выхаду працаваць поўны працоўны дзень? Ёсць шмат пытанняў, над якімі варта паразважаць.

За час чакання дзіцяці неабходна звыкацца з думкай, што цяпер вас будзе больш. Мужчыне трэба быць гатовым да таго, каб забяспечваць сям'ю неабходным, слухаць па начах плач дзіцяці, браць удзел у шэрагу дадатковых заняткаў. Жанчыне будзе нашмат складаней, паколькі ў першыя месяцы давядзецца цалкам прысвяціць сябе малому.

Трэба будзе дзіця карміць, пераадзяваць, мыць, гуляць з ім, а яшчэ займацца хатнімі клопатамі. Спатрэбіцца шмат сіл. Аднак галоўнай узнагародай будзе любоў малога, яго ўсмешка — шчасце, якое ні з чым не параўнаць.

Час цяжарнасці і для жанчыны, і для мужчыны можа быць нялёгкім. Мужчынам складана пераносіць капрызы жанчыны, перапады яе настрою, незразумелыя запатрабаванні, скаргі. Жанчыны ў гэты час пакутуюць ад таксікозу, баяцца родаў, далейшага жыцця. Абаім давядзецца з вялікай цярплівасцю ставіцца адно да аднаго.



Мужчынам варта часцей саступаць жанчыне, а ёй трэба ўсяляк падтрымліваць спакой. Жанчыне неабходна клапаціцца не толькі пра сябе, але і пра будучае дзіця. Вельмі важна рацыянальна харчавацца, ужываць садавіну, часцей бываць на свежым паветры, больш хадзіць, пазбягаць стрэсаў і негатыўных эмоцый. Перад родамі можна ўдваіх хадзіць па крамах і выбіраць рэчы для малога. Гэта звычайна дорыць шмат станоўчых эмоцый.

Большасць мужчын любяць разглядаць дзіцячыя цацкі. Ім жа варта даверыць і выбар каляскі.

Пару будзе чакаць яшчэ адзін складаны перыяд — чаканне выпіскі з радзільні. Большасці жанчын хочацца, каб яе хутчэй забралі і каб дома ўжо ўсё было падрыхтавана да гэтага вяртання.

Мужчыне варта засцерагаць жанчыну ад лішніх хваляванняў. А для таго, каб падрыхтавацца дома да сустрэчы папаўнення, можна прыцягнуць і бабуль з дзядулямі.

Самае важнае — абаім трэба расставіць прыярытэты. Калі вы разам глядзіце ў будучыню, то вы хутка прывыкніце да новых роляў — мамы і таты.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Калі ёсць пытанне

## КАМУ ПАЗВАНІЦЬ?

Дзеці, падлеткі і маладыя людзі ў Беларусі і ва ўсім свеце маюць магчымасць вырашыць свае праблемы дзякуючы дапамозе дзіцячых тэлефонных ліній. 17 мая па ініцыятыве Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых ліній дапамогі, членам якой з гэтага года з'яўляецца і наша Агульнанацыянальная лінія для дзяцей (**8 801 100 16 11**), адзначаўся Міжнародны дзень дзіцячых ліній дапамогі.

Асацыяцыя налічвае 178 ліній у 143 краінах свету, сярод якіх і наша. Яна працуе з 2011 года па ініцыятыве Міністэрства аховы здароўя, Міжнароднай грамадскай арганізацыі «Разуменне», РНПЦ псіхічнага здароўя і Белтэлекама. Падтрымаў лінію і мабільны апаратар МТС. Тэлефон працуе 24 гадзіны штодзённа на ўсёй тэрыторыі краіны са стацыянарных тэлефонаў і для абанентаў МТС.

Штодня на дзіцячую лінію паступаюць званкі ад дзяцей і дарослых. У асноўным гэтыя звароты звязаны са стасункамі паміж дзецьмі і дарослымі, падлеткамі і іх бацькамі, са спробамі жорсткага пакарання, гвалту ў сям'і, адсутнасцю ўзаемаразумення, праблемамі са здароўем. Працуе і сайт дзіцячай лініі: **1611.by.**

**Алена БЕРАСЦЯНКА.**

## НЕЎЛАДКАВАНЫЯ ВЫПРАЎЛЯЮЦЦА

**З 2007 па 2013 год 59% дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і адабраныя ў бацькоў, вернуты назад у сувязі з нармалізацыяй сітуацыі ў сям'і. Аб гэтым** БЕЛТА **паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Мінадукацыі Алена ГАЛАЎНЁВА.**

«У 2006 годзе быў прыняты Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у нядобранадзейных сем'ях». З яго прыняццем у краіне сфарміраваўся механізм міжведамаснай прафілактычнай работы з няўдалымі сем'ямі. Гэты механізм дае магчымасць даволі эфектыўна вырашаць праблемы нядобранадзейнасці і вывядзення сем'яў з сацыяльна небяспечнага становішча. Паказчыкам эфектыўнасці прафілактычнай работы з сем'ямі з'яўляецца колькасць дзяцей, вернутых у родную сям'ю. З 2007 па 2013 год з 28536 адабраных дзяцей 16720 вернуты бацькам», — сказала Алена Галаўнёва.

Аб аздараўленні сітуацыі ў сем'ях сведчыць і тэндэнцыя вяртання бацькам бацькоўкіх правоў. З 2007 года па рашэнні суда бацькам было вернута 2919 дзяцей (гэта кантынгент 42 дзіцячых дамоў).

Штогод у Беларусі скарачаецца колькасць дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Летась — 2750 дзяцей, што на 11% менш, чым у 2012 годзе. Для тых дзяцей, якія ўсё ж такі пазбаўлены бацькоўскага клопату, у рэспубліцы актыўна развіваюцца сямейныя формы ўладкавання. З 23081 дзіцяці-сіраты і тых, што засталіся без апекі бацькоў, 18179 дзяцей жывуць у замяшчальных сем'ях. За тры гады ў Беларусі былі закрыты 12 інтэрнатаў.

■ Без адваката не разбярэшся

# СПАДЧЫНУ — ПАРОЎНУ

**«У мяне двое сыноў. Малодшы з сям'ёй — нявесткай і ўнукам — жыве з намі, а старэйшы пабудаваў кватэру ў крэдыт, жыве асобна. Я хачу пакінуць кватэру дзецям, але пры гэтым не справакаваць паміж імі звадкі і падзелу маёмасці. Ці можна скласці завяшчанне і ўказаць у ім, каб пасля ўступлення ў спадчыну гэтая кватэра была прададзена на працягу пэўнага часу, а атрыманыя грошы падзяліць пароўну паміж сынамі? Хто наогул у гэтым выпадку можа прэтэндаваць на долі ад продажу кватэры, калі прапісаны ў ёй я, муж, малодшы сын з нявесткай і ўнучка, але ў прыватызацыі бралі ўдзел толькі мы з мужам і дзецьмі?»**

*Ірына Аляксандраўна, г. Мінск.*

Вывучыўшы пытанне нашай чытачкі, **адвакат юрыдычнай кансультацыі № 3 Мінскай абласной калегіі адвакатаў Таццяна БАЧАРОВА** ўнесла ўдакладненні:

— Хачу звярнуць увагу ўсіх, хто сутыкаецца з аналагічнай сітуацыяй: незалежна ад таго, на каго зарэгістравана права ўласнасці на кватэру, у выпадку, калі ў прыватызацыі прымаў удзел ваш муж (жонка), то кватэра з'яўляецца сумесна нажытай маёмасцю. Акрамя таго, дзеці таксама могуць вылучыць сваю долю ў праве ўласнасці на кватэру, прапарцыянальна налічанай ім пры прыватызацыі квоты. Вы, Ірына Аляксандраўна, у завяшчанні можаце распарадзіцца толькі маёмасцю альбо доляй у агульнай маёмасці, якая належыць менавіта вам. Пры гэтым абавязак спадчыннікаў у завяшчанні прадаць спадчынную маёмасць і падзяліць выручаныя грошы ў вас не атрымаецца: умовы такога кшталту завяшчанне змяшчаць не можа.

Рэгістрацыя ў названым жылым памяшканні вашай нявесткі і ўнучкі не звязана з правам уласнасці на кватэру, таму права на долю ў гэтай маёмасці яны не маюць і ніякіх прэтэнзій на грашовыя сродкі, атрыманыя ад продажу кватэры, заяўляць не могуць. Каб выключыць магчымыя спрэчкі і перадзел маёмасці паміж спадчыннікамі, мэтазгодна завяшчаць ім маёмасць у роўных долях. Пры гэтым варта ўлічваць, што завяшчальнік мае права адмяніць зробленае ім завяшчанне ў цэлым альбо змяніць яго шляхам адмены, змянення ці дапаўнення асобных распараджэнняў, якія ў ім змяшчаюцца, зрабіць новае завяшчанне. Такім чынам, пры неабходнасці можна па сваім жаданні змяніць умовы атрымання спадчыны (у часткі саставу спадчыннай маёмасці, спадчыннікаў, іх доляў у спадчыне і г.д.).

Маці пяці дзяцей Святлана СУШКЕВІЧ:

# «МЫ НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕЦЯМ ДАЛІ ЖЫЦЦЁ, АЛЕ І САБЕ ЯГО ПАДОЎЖЫЛІ...»

**Сям'я уздзенцаў Ігара і Святланы Сушкевічаў зацікавіла мяне задоўга да вочнага знаёмства. Гэта не жартачкі: яны гадуюць пяцярых дзяцей — чатырох дачок і сына. Старэйшая дачка ўжо на 5 курсе педагагічнага ўніверсітэта, а маленькі «каралевіч Елісей» яшчэ нават у садок не ходзіць, выхоўваецца дома. Прычым апошняе дзіця Святлана Дзмітрыеўна нарадзіла ўжо ва ўзросце за сорак!**



***— Няўжо не страшна было?*** — пытаюся ці не ў першую чаргу.

— Ніколечкі! — шчыра ўсміхаецца гаспадыня вялікага дома. — Я абажаю немаўлятак. Увогуле настолькі люблю дзяцей, што, калі раз'едуцца дзяўчаткі здаваць экзамены, адчуваю сябе ледзь не адзінокай, звар'яцела б без маіх любімых карапузаў. ...Яшчэ калі я выходзіла замуж, свякроў прадказала, што першым дзіцём будзе дзяўчынка. А я тады сказала: «Ведаеш, муж, вось будзе табе 40 гадоў, тады ў нас народзіцца сынок».

***— І ўгадалі...***

— А я не гадала — ведала... Бо калі ставіш перад сабой пэўную задачу і ідзеш да мэты, то ўсё збываецца. Трэба толькі паверыць, і тады ўсё будзе так, як уяўлялася яшчэ ў дзяцінстве. Вось так і я сабе «запланавала» сына. І ўсе сяброўкі і родныя загадзя ведалі, што хлопчыка я назаву ў гонар свайго дзядулі — Елісеем. Дзед быў вялікім чалавекам, тры вайны прайшоў, столькі значных спраў зрабіў... Мы дагэтуль захавалі яго кашулю, і, калі ёсць нагода, муж яе апранае.

## Пра таленты ў спадчыну

У Сушкевічаў наогул моцная сувязь «парасткаў» з «каранямі». Бабуля Святланы Дзмітрыеўны, кажуць, была майстрыха, якіх пашукаць, бацькі былі музыкантамі — і ўсе гэтыя таленты ў той ці іншай ступені перадаліся і маці, і дзецям. Старэйшая дачка, Сафія, увесь вольны ад вучобы час іграе ў тэатры — спалучае мастацтва і псіхалогію, захапляецца жывапісам і выступае завадатарам і генератарам новых творчых ідэй для сясцёр. Жэня, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, малюе, у тым ліку на шкле, тчэ, спявае і танцуе. Адзінаццацікласніца Уздзенскай раённай гімназіі Яна не толькі музіцыруе — яна ў сям'і яшчэ і галоўны камп'ютарны геній. Акрамя таго, усе трое добра кухараць і захапляюцца дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам. Лялькі-абярэгі, карціны, міні-скульптуры, брошкі, кветкі, вышыванкі — што толькі не ўпрыгожвае бацькоўскую хату! Асвойваюць і вельмі любяць лепку з розных матэрыялаў Ангеліна і Елісей. І ўсё гэта пры актыўным удзеле мамы, якая не толькі тэхнолаг па дрэваапрацоўцы (па адукацыі), але яшчэ няўрымслівая творчая асоба па натуры. А пра адмысловы вулічны ліхтар (постаць Бабы-Ягі ў 2,5 метра вышынёй, вылепленую ўласнаручна Святланай Дзмітрыеўнай з таямнічых «фірменных матэрыялаў») і самаробны камін Сушкевічаў ведаюць усе суседзі.

Той факт, што па ўзросце яна даўно не маладая мама, Святлану Дзмітрыеўну ніколькі не бянтэжыць. «Нават муж, калі ў яго пытаюцца, колькі мне гадоў, адказвае: маўляў, не ведаю, у пашпарт яе ніколі не глядзеў. А я сябе адчуваю... нават не ведаю, на колькі гадоў. Мне, напэўна, цяпер менш, чым ім, — ківае ў бок старэйшых дачок. — Мы не толькі дзецям далі жыццё, але і сабе падоўжылі!»

— Мабыць, вялікая сям'я — гэта спадчыннае? У маёй мамы было 11 дзяцей. Праўда, на жаль, не ўсе дажылі да сёння. Якраз на мамін дзень нараджэння прыедуць многія, з дзецьмі, унукамі — нават не ведаю, як мы ў доме змесцімся!



## Пра процілегласці, якія прыцягваюцца

— Пра мужа расказаць? — з хітрынкай пытаецца Святлана Сушкевіч. — Пра яго сказаць можна ўсё, але галоўнае — што ён ураўнаважвае і церпіць мяне такую... часам невыносную. Я ж вельмі прыдзірлівая; мы доўгі час разам працавалі: я — тэхнолагам, ён — цесляром, і я спуску не давала. Мужчыны вельмі не любяць, калі ў жанчыны востры язык, а ў мяне ён настолькі востры — дагэтуль не ведаю, як муж дазваляе яго «тачыць». Напэўна, таму і стварыў Бог нашу сям'ю, каб розныя характары дапаўнялі адзін аднаго, бо муж увасабляе спакой, часам нават празмерны, а я — генератар энергіі, і яго пастаянна падсілкоўваю. А яшчэ ў Ігара залатыя рукі, і кожную маю ідэю ён можа ажыццявіць.

У Ігара Анатольевіча наконт узаемнага цярпення свая версія: «Калі ў доме робіцца занадта шумна і ўсе віруюць ідэямі — у мяне ёсць гараж. Мая справа — не гаварыць, а рабіць». І ён робіць — не важна што: плот, ці мэблю, ці перастаноўку ў пакоі. Калі спатрэбіцца, шмат разоў і на працягу многіх гадоў. Так і дом збудаваў — сам, без дапамогі пабочных людзей.

— Як я прыехала сюды па размеркаванні, мы набылі маленькі пакойчык, і ўвесь час, амаль 20 гадоў, дабудоўвалі яго, перараблялі, зноў дабудоўвалі.

**Мужчыны вельмі не любяць, калі ў жанчыны востры язык, а ў мяне ён настолькі востры — дагэтуль не ведаю, як муж дазваляе яго «тачыць». Напэўна, таму і стварыў Бог нашу сям'ю, каб розныя характары дапаўнялі адзін аднаго.**

Знаёмыя толькі кпілі: калі вы ўжо супакоіцеся? А як спынішся, калі дзяцей усё больш, і ім патрэбна прастора? — распавядае Святлана Дзмітрыеўна. — Як стала пяцёра дзяцей, давялося зноў пашырацца. Узялі крэдыт, набылі дом. Некаторыя прыходзяць, кажуць: "Гэта музей». Ды не, звычайны дом. Проста такі... творчы. Я вельмі люблю выкарыстоўваць старыя рэчы (мэблю, кнігі — усё тое, што многія лічаць «барахлом») — каб рэчы зноў ажывалі, каб у іх абуджалася душа.

## Пра кожнага паасобку і адно цэлае

З пяццю дзецьмі, пагаджаюцца шматдзетныя бацькі, сапраўды бывае па-ўсякаму — і цяжка, і часу не хапае, і розніца ў светаўспрыманні адчуваецца (усё ж бацькі раслі яшчэ «ў савецкі час», у іншым грамадстве і нават у іншую эпоху), таму не ўсе захапленні і інтарэсы сучаснай моладзі ім зразумелыя. «Па характары ўсе яны розныя, чым выдатна дапаўняюць адно аднаго. Соня — напэўна, гэткі ж халерык, як і я, хутка загараецца, можа нават «выбухнуць», але яна настолькі справядлівая, што не дазваляе сабе крыўдзіць іншых. Жэнечка ў нас з нараджэння прынцэса — з-за пачуцця годнасці і нейкай асаблівай вытанчанасці, што адчуваецца і ў яе карцінах, і ў вершах. Яначка — дзіця сучаснага свету, хутчэй за ўсіх разбіраецца ў тэхніцы і сябруе з ёй. Ангеліна — анёл, і гэта найбольш трапная для яе характарыстыка. Калі мы, бывае, пачынаем буркатаць у адрас адно аднаго, Ангеліна просіць: «Мам, я больш не магу гэтага чуць — супакойцеся, калі ласка», — і мы бяром сябе ў рукі. Елісей таксама не любіць тлуму, ён міратворац, калі трэба некага суцішыць, цішком падыходзіць і гаворыць: «Чш-ш-ш». Але галоўнае, што я іх усіх абажаю, а яны гэта добра ведаюць і любяць нас з татам».

— Мы на ўласным прыкладзе імкнёмся паказаць: шматдзетная сям'я — гэта не тое, што людзі думаюць (маўляў, нехта напладзіў дзяцей, сеў на шыю дзяржаве, п'е, дэбашырыць і ўсё). Няпраўда, зусім наадварот. Мы прытрымліваемся здаровага ладу жыцця. У маёй мамы 9 дачок, і ўсе непітушчыя. Я за ўсё жыццё кроплі ў рот не брала ні з якой нагоды. Так, вялікая сям'я — справа складаная, цяжкая, гэтага ніхто не адмаўляе. Аднак нам значна лягчэй, чым было нашым мамам і бабулям. Цяпер ёсць столькі магчымасцяў для развіцця, адукацыі, самарэалізацыі, творчасці — толькі паспявай выкарыстоўваць!

— У сям'і і павінна быць шмат дзяцей, — пагаджаецца Ігар Анатольевіч. — А як інакш? Нас у бацькоў было чатыры браты, адзін за аднаго гарой. Лічу, як мінімум адзін сын павінен быць у кожнай сям'і. Але незалежна ад таго, хлопцы ў вас ці дзяўчаты, трэба, каб з дзяцінства яны ведалі, што самае галоўнае і святое ў жыцці чалавека — гэта сям'я. Мы ў сваіх пастараліся, як маглі, гэта пачуццё ўкараніць.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

■ Моцныя, дружныя, таленавітыя

# ХОЦЬ БЫ ЯШЧЭ СТОЛЬКІ!..

## На Міншчыне абверглі міфы і стэрэатыпы пра шматдзетных

**Збоку здаецца, што ў шматдзетных сем'ях жыццё ідзе па адным сцэнарыі: садкі-школы, паліклінікі, бытавая мітусня, тата-«здабытчык», які бясконца на працы, і мама, «прапісаная» паміж кухняй і прасавальнай дошкай. Дзе тут знайсці час не тое што на хобі і творчасць — на сябе? ...Але гэта толькі здаецца. Прынамсі, міфы і стэрэатыпы пра шматдзетных абвергла кожная з 5 сем'яў — удзельніц абласнога конкурсу на лепшую сям'ю.**

Яны ўразілі літаральна з парога раённага Дома культуры. Сям'я Клімовічаў з вёскі Навіна Бярэзінскага раёна давала ўсім ахвотным майстар-клас па вырабе лялек з тканіны, набітых духмянымі зёлкамі: і абярэг, і здароўю карысць. Сям'я Барташэвічаў з аграгарадка Сноў Нясвіжскага раёна ахвотна дэманстравала не толькі гожа складзеныя букеты — захапленне мамы фларыстыкай, але і самаробныя, «правільныя» венікі для лазні — бацькавай работы. А мама траіх дзяцей з Вілейшчыны Вольга Суханава паказвала, што яна ўмее не толькі «мыць раму», але і варыць мыла — пахкае, натуральнае, прыгожае, нібы цукеркі.

Прадстаўляць свае сем'і бацькам дапамагалі і дзеці. Старэйшым з іх ужо больш за 20, малодшаму ўсяго годзік, але на сцэне ўсе яны з аднолькавым імпэтам удзельнічалі ў конкурсах «Сямейная візітоўка», «Бацькоўскае шчасце» і «Здароўе шматдзетнай сям'і», раскрывалі свае творчыя здольнасці і спартыўныя таленты, праяўлялі кемлівасць і ўменне працаваць у адной зладжанай камандзе, гаварылі вершамі і прозай, і нават... здымалі фільмы.

«Мы ледзь не перасварыліся, высвятляючы пераможцу. Бо як тут выбраць лепшага, калі ў атмасферы любові, дабрыні, цеплыні і творчасці сённяшнія ўдзельнікі ўсе — лепшыя? — зазначыў **намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр ЮШКЕВІЧ.** — Таму вырашылі, што адна ўзнагарода — гэта вельмі мала, і налета будзем прысуджаць прызы па некалькіх намінацыях». Сёлета ж найлепшай шматдзетнай сям'ёй Міншчыны стала сям'я Ермаловічаў з Салігорскага раёна: мама Алена — выхавацель у дзіцячым садку, тата Генадзь — майстар энергасетак, і чатыры іх сыны. Пераможцы атрымалі віншаванні і памятны дыплом, а таксама матэрыяльны бонус у 4,5 мільёна рублёў.

Ці лёгка адной жанчыне ўпраўляцца з такой, амаль хакейнай, мужчынскай камандай? «Напэўна, калі б з самага пачатку тата не ўзяў стырно ўлады ў свае рукі, то было б цяжкавата, — пагаджаецца Алена Ермаловіч. — Але тата абвясціў, што мама — крохкая, пяшчотная, аб ёй трэба клапаціцца. І таму мае хлопцы з самага маленства раслі мужчынамі. Збіраючы першыя кветкі, маглі вытаптаць увесь кветнік перад домам, але ж галоўнае, што гэта — букет для мамы. Мне пакідалі і самыя смачныя кавалачкі, і дзяліліся цукеркамі...».



У Ермаловічаў няма падзелу на «мужчынскую» і «немужчынскую» працу — ва ўсіх хатніх справах хлопцы — надзейныя памочнікі. Больш за тое, другі сын Саша марыць стаць поварам і заўжды прасіўся паўдзельнічаць з мамай у кухарскай справе. «Былі ў нас гарэлыя талеркі і пабіты посуд, не без таго, — усміхаецца маці, — але цяпер Саня ўмее прыгатаваць як мінімум тры салаты і фірменную страву — салодкія вафлі». Старэйшы, Андрэй, вучыцца ў Мінскім абласным кадэцкім вучылішчы, таму і дома прытрымліваецца армейскай дысцыпліны і парадку, да якога прывучае малодшых братоў. Разам з тым, з гонарам распавядаюць бацькі, ён паліглот і выдатнік вучобы, прызёр разнастайных алімпіяд. Трэці сын, Аляксей, самы сціплы з усіх — што не перашкаджае яму займацца лёгкай атлетыкай і захапляцца лепкай з гіпсу, а калі трэба, забраць малодшага, Дзімку, з дзіцячага садка. Будучы першакласнік Дзіма праяўляе зайздросную ўседлівасць і асвойвае квілінг (мастацкае скручванне з паперы).

Па першай адукацыі Алена Аляксандраўна бухгалтар. Прызнаецца, што атрымаць педагагічную спецыяльнасць вымусіла жыццё: занадта ўжо



не падобнымі адзін да аднаго былі два першыя сыны, і, каб не памыліцца ў выхаванні, давялося ісці вучыцца. «Цяпер я разумею, што двух аднолькавых дзяцей быць не можа», — зазначае маці.

— Некаторыя знаёмыя смяюцца, што не было б у нас чатырох хлопцаў, калі б так не хацелася дачкі. Думаем над гэтым пытаннем, — зазначае Алена Ермаловіч. — Адчуваю часам, што мне ўжо мала дзяцей — хоць бы яшчэ столькі! Бо старэйшыя падраслі, робяць ужо ўсё самастойна, і ты не ведаеш, чым сябе заняць... Можа, гэта кампенсацыя — я расла ў бацькоў адна, а ў мужа быў толькі брат, але я шчаслівая, што ў нас менавіта так усё атрымалася.

❍❍❍

Дарэчы, паводле слоў **намесніка старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Тамары ТРУБЧЫК,** у Мінскай вобласці колькасць шматдзетных сем'яў з трыма і больш дзецьмі штогод павялічваецца. Сёння іх ужо больш чым 11 тысяч, і 1435 матуль адзначаны ордэнамі Маці.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*Мінск—Узда—Мінск*

■ Фотаздымак з гісторыяй

# «БО МЫ — ЯК ГОЛЛЕ І КАРЭННЕ...»

**«Заўсёды з хваляваннем разглядаю гэты маленькі (усяго пяць на восем сантыметраў) фотаздымак. Прайшло 60 гадоў, але, мне здаецца, ён зусім не змяніўся. Чаго не скажаш пра жыццё людзей на ім, — піша нам настаўніца Мачульскай базавай школы Столінскага раёна, а яшчэ і член Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіна Бабарыка. — Хлопчык на фота — мой брат-нябожчык Коля. Ён памёр ад шкарлятыны ў дзесяць гадоў. Я не памятаю яго: калі Міколка пайшоў з жыцця, мне быў усяго год. Ведаю толькі са слоў старэйшых, што захварэла тады многа дзяцей, але направіліся. А вось сям'я маіх бацькоў страціла першынца, а дзед Піліп (ён таксама на здымку, сядзіць каля Колі) першага ўнука. Гэтак жа адразу пасля вайны за тыдзень памерлі адзін за адным ад хваробы дзедавы сыны, браты маёй мамы. Засталіся адны дочкі. Вунь мая маці Хадося, зусім яшчэ маладая, стаіць за сваім бацькам. А побач — Ганька, тады яшчэ школьніца, і старэйшая Наталка.**



Дзядуля, Піліп Ерамеевіч Супрунчык, рос у шматдзетнай сям'і: у яго бацькі было шасцёра сыноў. Як жа было падзяліць невялікі кавалак зямлі на ўсіх? Таму, калі прыйшоў час жаніцца, Піліп пайшоў у прымы. Бабуля Паўліна (на здымку яна сядзіць побач з унукам) нарадзілася таксама ў вялікай сям'і, але, калі была зусім малая, яе на выхаванне забраў родны дзядзька, у якога не было дзяцей.

Калі пачалася вайна, расказвае Галіна Сідараўна, яе дзед Піліп быў яшчэ не старым, але ў армію не трапіў: надта ўжо хутка фашысты захапілі гэтыя землі. З'явіліся ў лясах партызаны, але групы былі разрозненыя, сілы слабыя. «Аднойчы ў вялікай вясковай хаце партызаны сабралі сход. Жыхароў прыйшло вельмі многа. Выправілася туды і бабуля Паўліна з дзецьмі. А дзед чамусьці не пайшоў, быў заняты сваёй работай каля хлява. Раптам ён убачыў групу коннікаў, якія ўжо паварочвалі на іх вуліцу. Апякла думка: нехта данёс... Як віхор ён уляцеў у хату, дзе адбываўся сход, закрычаў: «Сядзіш тут! Зараз пастраляюць!» Гэтыя словы былі адрасаваны жонцы, але на вуліцу рванулі ўсе... Сям'я не паспела дабегчы да сваёй хаты, сталі ў лагчыны. А тут паліцыя: «Дзе партызаны?». А хто ж скажа? Партызаны ў гэты час былі за ракою, ішлі ў бок лесу. Пастралялі ў той бок паліцаі ды супакоіліся. Вось так не загінуў ніхто з удзельнікаў сходу.

Бабуля Паўліна памерла ў 1980 годзе. Яна была моцнай жанчынай, але недарэчнасць абарвала яе жыццё: вярталася з далёкай дарогі дадому, вельмі хацела піць, узяла з дачным сумкі бутэльку — думала, ліманад. А гэта аказалася кіслата для акумулятара... Бабуля пражыла яшчэ два месяцы. З мінскай бальніцы, куды яе адправілі на самалёце адразу пасля здарэння, яна пачала прасіцца дадому. У гэты час я нарадзіла сваю дачку Тацццяну. Ужо дома ўзнікла ўскладненне, і бабуля параіла папіць адвар травы, які мяне, мабыць, выратаваў.

Дзядуля памёр праз дзесяць гадоў. Калі мая маці занесла яму ежу, бо ён ляжаў ужо вельмі хворы, прапанавала паесці ў ложку, то дзед сказаў: «Як гэта, у ложку есці?» — і падняўся. А на другі дзень яго не стала... Дзед быў працаўнік, якіх трэба яшчэ пашукаць. Я іншым разам, разглядаючы гэты здымак, думаю: як гэта ён сфатаграфаваўся з усімі? Заўсёды ён меў нейкую справу, займаўся пчоламі, садам. Такога саду, дарэчы, не было ні ў кага ў вёсцы. Дзед не пашкадаваў пад яго зямлі, і грушы, яблыні раслі не ў агародзе, як у астатніх суседзяў. Кожнае дрэўца было дагледжана, дзед умеў рабіць прышчэпкі. Яблыкаў ды груш хапала ўсім ахвотным. Мы, дзеці, любілі хадзіць з бацькамі на святы, у нядзелю ў госці да дзеда і бабы. Там заўсёды частавалі садавінай, мёдам у сотах. І ніколі мы не чулі ні ад дзеда, ні ад бабулі дрэннага слова, у сям'і панавала павага, добразычлівасць.

Старэйшая дзедава дачка, цётка Наталка, выйшла замуж позна. Пабралася шлюбам з удаўцом, у якога было ўжо трое дзяцей. Нарадзіліся свае трое. Доўгі час я не ведала, што дзеці не ўсе цётчыны. Яна ставілася да дзяцей мужа як і да родных — наогул была прыкладам самаахвярнасці. Калі цётка Наталка даведалася, што малодшая сястра Ганна цяжка хворая, то вельмі востра, блізка да сэрца прыняла гэтую бяду і хутка пайшла з жыцця.

А праз два гады не стала і цёткі Ганькі. Самая малодшая з сясцёр, яна больш за ўсіх астатніх пабачыла свет: у маладосці адправілася на Поўнач, працавала геолагам, пасля жыла ў Крыме. Памятаю, як усе пляменнікі знаходзілі ў яе пасылках цацачныя машынкі, а таксама салодкі вінаград. Потым цётка вярнулася на радзіму, працавала паштальёнкай у нашай вёсцы. Старэйшая яе дачка цяпер жыве ва Украіне, малодшая — у горадзе Століне, сын жыве і працуе ў родный вёсцы.

Мая маці, дзякуй Богу, жывая, хоць і вельмі хварэе. Акрамя Колі, яна страціла і старэйшую дачку, якая памерла ў 37 гадоў. Затое ў мамы ёсць 5 унукаў і 4 праўнукі. Па просьбе мамы мой сын быў названы Мікалаем. У гэтым годзе ён, позняе дзіця ў сям'і, ужо заканчвае ўніверсітэт. Жыццё працягваецца. Я пішу вершы. У адным з вершаў ёсць такія радкі:

Як лёгка думаць у садах
Аб чалавечым прызначэнні,
Бо мы, як голле і карэнне,
Мы — і пачатак, мы — і працяг...»

ⲟⲟⲟ

*Шаноўныя чытачы! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце на рэдакцыйную пошту альбо электронную скрыню info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе ўзнагароджаны каштоўным прызам.*

*Увага! Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

# ПАЧАТАК НОВАГА ЖЫЦЦЯ

Залатыя правілы народнай культуры

**Першыя тры дні жыцця нованароджанага асабліва значныя, хоць, можа быць, мы не заўсёды цалкам усведамляем іх важнасць. Напэўна, зусім не выпадкова, што вяселле — пераход маладой пары ў новае сямейнае жыццё — беларусы гулялі тры дні; пераход чалавека ў іншы свет — ад моманту смерці і да пахавання — доўжыўся, паводле народных традыцый, усе тыя ж тры дні. А нараджэнне чалавека — не што іншае, як той самы пераход з мацярынскага ўлоння да жыцця ў зусім новым свеце.**

**1.** На першыя тры дні пасля нараджэння немаўляці ў сям'і ўводзілася правіла, якое захоўвала стабільнасць і жыццёвае пастаянства, духоўна-энергетычную раўнавагу: **забаранялася штосьці аддаваць, выносіць, прадаваць, пазычаць, ад'язджаць** і г.д. Тым самым «абаранялі» лёс, долю дзіцяці, каб тое, калі вырасце, «не цуралася роднай хаты» (або, як казалі старыя людзі, «не стала валацугаю»).

**2.** Калі на свет з'яўлялася **дзяўчынка**, то над ёй тры разы чыталі малітву "Песня Найсвяцейшай Багародзіцы". Калі нараджаўся **хлопчык**, то тройчы чыталі Гасподнюю малітву «Ойча наш».

**3.** Народная мудрасць па рознаму ўспрымала сімволіку правага і левага. **Правае** — гэта рух наперад, развіццё, левае — стабільнасць і спакой. Менавіта таму ўсе **першыя значныя падзеі** ў жыцці толькі што народжанага чалавека здзяйснялі з улікам станоўчага пачатку, замацаванага за правым: пры першым кармленні дзіцяці прыкладвалі да грудзей матулі справа, падчас першага спавівання яго клалі на правы бок, у калыску ўкладвалі таксама на правы бок.

**4.** Адразу пасля нараджэння нашы продкі практычна не выкарыстоўвалі пялёнкі. Бабка-павітуха **загортвала немаўля ў бацькоўскую кашулю або матуліну спадніцу**, каб яно любіла і паважала бацькоў. Стараліся не браць адзенне таго з бацькоў, у каго быў складаны, рэзкі характар. Часам хлопчыка загортвалі ў адзенне маці, а дзяўчынку — у адзенне бацькі, каб такім чынам уладкаваць мір і спакой у сям'і. Лічылася, што калі загарнуць нованароджанае дзіця ў кашулю дзеда, яно будзе доўга жыць.

**5.** Немаўля, незалежна ад полу, першы раз спавівалі абавязкова ў **пялёнкі белага колеру,** перавязваючы вузкім **поясам чырвонага колеру.** Пры гэтым казалі:

«Блаславі, Госпадзі, немаўля на доўгае жыццё!
У ногі — добрыя дарогі.
Рукам — сілу, галаве — розум.
У імя Айца і Сына і Святога Духа. Амін».

Або так:

«За ручкі бяру — каб бралі і рабілі,
За ножкі бяру — каб хадзілі і бегалі,
За галаву бяру — каб роздум і розум быў».

**6.** Прыглядаліся: **калі дзіця ў час першага спавівання будзе крычаць,** то вырасце сярдзітым.

**7.** Дзіцячыя рэчы (пялюшкі, цацкі і г.д.) да года **забаранялася каму-небудзь аддаваць** ці прадаваць, а таксама спальваць.

*(Працяг будзе.)*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

■ 100 гадоў таму

# «ДЗІЦЯ БЕЗ ПРЫЧЫНЫ ПЛАКАЦЬ НЕ БУДЗЕ»

*Люлі, люлі, люлі.*
*Прыляцелі куры.*
*Селі каля люлі.*
*Сталі сакатаці.*

*Сталі сакатаці.*
*А што курам даці?*
*Ці аўса з каўша,*
*Ці жыта з карыта,*
*Ці ячменю жменю,*
*Ці гароху троху?*

*Куркі сакаталі,*
*Зярняткі клявалі.*
*А як з'елі грэчку,*
*Знеслі па яечку.*

*Люлі, люлі, люлі.*
*Вочанькі заснулі.*
*Люлі, люлі, люлі,*
*Люлі, люлі, люлі.*

Вось такую просценькую калыханку ў далёкія ўжо 50-я гады мінулага стагоддзя мая (светлай памяці!) свякроўка спявала сваім унукам і вельмі шкадавала, што ў гарадской кватэры нельга павесіць зыбку. Рабілі яе, такую калысачку, з лёгкіх ліпавых дошчачак, потым на чатырох вяровачках падвешвалі да гнуткага шаста, замацаванага пад столлю. Донца зыбкі высцілалася пахкім мурагом, які можна было мяняць, бакавінкі абвешваліся абрусам ці кавалкам тканіны. Да дна зыбкі прымацоўвалася адмысловая пятля: калі рукі ў жанчыны былі занятыя (шыццём, вязаннем ці іншай справай), зыбку маглі калыхаць нагой.

А яшчэ мая мудрая свякроўка не давала малечы пустышак. Казала, што здаровыя, дагледжаныя немаўляткі часта гуляюць, усміхаюцца, а соска можа замяніць, перашкаджаць развіццю...

Яна ж гаварыла, што без дай прычыны дзіцятка плакаць не будзе: яно альбо спіць, альбо забаўляецца. Іншая рэч, калі рэжуцца зубкі... Тады ў ручкі малому яна давала невялікую морквінку, кавалак яблыка ці сушку. З іх дапамогай дзіця само рабіла масаж сваім дзяснам, якія ў гэты час і свярбяць, і баляць.

Вось так нашы дзеткі раслі.

Трэба дадаць, што іх мамы ў той час у дэкрэтным «сядзелі» толькі 2 месяцы.

**Алена МАРОЗАВА, г. Мінск.**

■ І жартам, і ўсур'ёз

# 12 АДКРЫЦЦЯЎ, якія ты зробіш, стаўшы бацькам



**1. Кватэра смяротна небяспечная.** Усе прадметы, якія ляжаць ніжэй за ўзровень твайго поясу, будуць альбо знішчаны, альбо выкарыстаны для нанясення пашкоджанняў. 90% тваіх спраў па «выхаванні» дзіцяці — гэта спробы выратаваць яго ад траўмы.

**2. Сон — новая эратычная фантазія.** Восем беспрабудных гадзін — гэта лепш, чым прыняць ванну з сексапільнай бландзінкай. Зрэшты, на сон у цябе яшчэ ёсць сілы.

**3. У цябе непрыемны характар.** Ты пазнаеш сябе ў капрызах дзіцяці, у яго упартасці, у яго шкоднасці. Яно падобна на маленькае крывое люстэрка. (Заадно зразумееш, якой стрэмкай у адным месцы ты быў для сваіх бацькоў.)

**4. Затое ты станеш ідэалам для дачкі.** Менавіта ты сфарміруеш яе густ у дачыненні да мужчын. Пастарайся адпавядаць, калі хочаш, каб у цябе з часам з'явіўся прыстойны зяць.

**5. Не ўсё залежыць ад цябе.** Калі ты ўпершыню ўпусціш дзіця на падлогу і яно вытнецца галавой (не «магчыма», а менавіта «калі»), ты будзеш маліцца, каб усё скончылася добра. Нават калі не ведаеш ніводнай малітвы і ніколі ні ў каго не верыў.

**6. Ты — «дрэнны» следчы.** Да двух гадоў дзіця навучыцца маніпуляваць тваёй жонкай гэтак жа лёгка, як каўбой круціць ласо. Калі не хочаш жыць з маленькім дыктатарам, табе самому давядзецца камандаваць, караць і 50 разоў на дзень казаць слова «не». Непрыемная роля, але нехта павінен гэта рабіць.

**7. Вольны час — калі яно спіць.** Дзіця — працадаўца, які не ведае Працоўнага кодэкса. Выхадных для яго не існуе.

**8. Маленькі не значыць ціхі.** Няхай ён важыць шэсць кіло — калі пакрыўдзіцца на нешта, ён па-майстэрску імітуе гук звяна «Су-35» у рэжыме атакі. Так, а некаторыя яшчэ ў сне храпуць. Басам.

**9. Добры мультфільм можна паглядзець 50 разоў.**

**10. Ты мог бы весці перамовы з тэрарыстамі.** «Ён не хоча на вуліцу. Не, ён хоча на вуліцу. Не, гэтыя пальчаткі не падыходзяць. Не, ён не будзе прасоўваць ручку ў рукаўчык. Не, ён усё ж не хоча на вуліцу. Гэта — мая цацка, хоць яна і чужая...» Усе перамовы — мяккім голасам, з усмешкай і памяншальна-ласкальнымі суфіксамі.

**11. Шчасце ёсць.** Дзіця не толькі само шчыра перажывае ўсё, што адбываецца, але і цябе прымушае адчуваць вельмі вострыя радасць, пяшчоту, замілаванне. Якім бы цынікам ты ні быў, ад многіх яго ўчынкаў і фраз табе прыйдзецца выціраць слёзы замілавання. І няма чаго тут саромецца.

**12. Ты — конь, і-га-га.**

*У народзе кажуць: «БАГАТЫ АЎДЗЕЙ: ПОЎНА ХАТА ДЗЯЦЕЙ».*

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 400/С-69052 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта), площадью 116,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121/4** |
| Местонахождение объекта | г. Гродно, ул. Максима Горького, 121/4 |
| Лот расположен на земельном участке | Кадастровый номер 440100000002007937, площадью 0,031 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания канализационной насосной станции) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121/4. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код – 13,5, площадь – 0,0102 га |
| Начальная цена продажи | 502 637 130 (пятьсот два миллиона шестьсот тридцать семь тысяч сто тридцать) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 25 131 857 (двадцать пять миллионов сто тридцать одна тысяча восемьсот пятьдесят семь) белорусских рублей |
| Продавец | Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |
| **Аукцион состоится 23 июня 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 17 июня 2014 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 25 июня 2014 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи, участок 1177 | 340100000008003802 | 0,0810 | для строительства и обслуживания одноквартирного блокированного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме) | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Ограничения в использовании в связи с расположением в охранной зоне линий связи и радиофикации – 0,0027 га. | 99 | 12 725 700 | 2 545 000 | 7 119 538 |
| 2 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи, участок 81 | 340100000008002359 | 0,0810 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме) | | Ограничений в использовании нет. | 99 | 12 725 700 | 2 545 000 | 6 354 050 |
| 3 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи, участок 14 | 340100000008002264 | 0,0810 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | | Ограничений в использовании нет. | 99 | 12 725 700 | 2 545 000 | 6 354 050 |
| 4 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи, участок 270 | 340100000008002420 | 0,0798 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме) | | Охранная зона линий связи и радиофикации – 0,0011 га. | 99 | 12 537 200 | 2 507 000 | 6 494 300 |
| 5 | ул. Могилевская (район здания по ул. Могилевской, 5) | 340100000005006597 | 0,2081 | для размещения объекта производственного и складского назначения (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения) | | Ограничения в использовании – охранная зона линий электропередач – 0,0135 га. Условия: согласование проектно-сметной документации с городским узлом электросвязи, при необходимости предусмотреть вынос сетей связи; предусмотреть вынос кабельной линии. | 25 | 151 916 750 | 30 383 000 | 10 640 809 |
| 6 | ул. Интендантская | 340100000003002870 | 0,0600 | для размещения станции технического обслуживания автомобилей (шиномонтаж) (земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) | | Ограничений в использовании нет. | 30 | 63 527 050 | 12 705 000 | 9 337 103 |
| 7 | пр-т Речицкий (парк «Фестивальный») | 340100000006004975 | 0,0100 | для установки и обслуживания торгово-бытового павильона с комплексом бытовых помещений (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения) | | Соблюсти охранные зоны газопровода, водопровода, канализации | 10 | 8 043 600 | 1 608 700 | 10 399 233 |
| 8 | Индустриальный проезд, 12а | 340100000005006607 | 0,1595 | для ремонта и технического обслуживания автомобилей (земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) | | Ограничения в использовании – охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0024 га. Условие: согласование проектно-сметной документации с городским узлом электросвязи, выполнять экологические требования и требования санитарного законодательства | 30 | 154 118 050 | 30 823 600 | 9 943 891 |
| 9 | в микрорайоне Энергетиков в районе жилого дома № 31 | 340100000005005099 | 0,0019 | для эксплуатации и обслуживания торгового киоска (для размещения объектов розничной торговли) | | Ограничений в использовании нет. | 1 | 155 850 | | 0 |
| 10 | ул. Крестьянская | 340100000001005704 | 0,0070 | для установки и обслуживания легкотипного торгового павильона | | Ограничений в использовании нет. | 1 | 3 113 200 | 622 600 | 9 639 968 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, а также в соответствии с Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 607 «О внесении дополнений и изменений в некоторые постановления Совета Министров Республики Беларусь по вопросам проведения аукционов, конкурсов». Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту.

3. **Аукцион состоится 25 июня 2014 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в управление коммунальной собственности в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с 3642402000226 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности горисполкома. Кроме того, представляют:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 19 июня 2014 г.** включительно в управлении коммунальной собственности горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Контактные телефоны: 77-69-35; 77-67-27; факс: 77-48-85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by**

ДЭПАРТАМЕНТ
ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
07 мая 20 14
Прозвішча
Подпіс

ТЕХНОБАНК

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ТРИНАДЦАТОГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ТЕХНОБАНК»

**1. ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ**

**1. Наименование эмитента**

на белорусском языке:
полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Тэхнабанк»,
сокращенное – ААТ «Тэхнабанк»;
на русском языке:
полное – Открытое акционерное общество «Технобанк»,
сокращенное – ОАО «Технобанк».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Место нахождения ОАО «Технобанк» (юридический и почтовый адрес): Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Телефон/факс: +375 17 283 15 05.
Адрес в интернете: www.tb.by.
E-mail: info@tb.by.

**3. Номера счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

Денежные средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, будут зачисляться на балансовые счета 4940 в ОАО «Технобанк», г. Минск, код 182.

**4. Наименование периодических печатных изданий, определенных Эмитентом для публикации отчетности и иной информации**

Краткая информация об открытой продаже облигаций тринадцатого выпуска публикуется в газете «Звязда».

Информация о внесенных изменениях в проспект эмиссии публикуется в газете «Звязда» в семидневный срок со дня регистрации таких изменений в регистрирующем органе.

Годовой отчет эмитента в формах, определенных пунктом 8 Инструкции о порядке представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 21 декабря 2010 г. № 157 «О некоторых вопросах представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 12, 8/23164), публикуется в газете «Звязда» в течение трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года. С указанной информацией также можно ознакомиться на официальном интернет-сайте ОАО «Технобанк» по адресу: www.tb.by.

В случае принятия в отношении ОАО «Технобанк» решения о реорганизации или ликвидации, либо в случае возбуждения в отношении банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), соответствующая информация размещается и публикуется в порядке и в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента.**

Эмитента обслуживает депозитарий ОАО «Технобанк», расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385568, выданного Министерством финансов Республики Беларусь; лицензия продлена на основании решения от 29 мая 2009 года № 155 сроком на пять лет и действительна до 22 июня 2014 года, зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь за № 5200-1246-1018.

ОАО «Технобанк» зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 05 августа 1994 года, регистрационный номер № 47. ОАО «Технобанк» создано в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем преобразования ООО СКБ «Технобанк» в ОАО СКБ «Технобанк» с последующим переименованием в ОАО «Технобанк». ОАО «Технобанк» является правопреемником всех прав и обязанностей ООО СКБ «Технобанк», ЗАО «Торгово-Промышленный Банк», ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

**6. Размер уставного фонда эмитента**

Сумма зарегистрированного уставного фонда ОАО «Технобанк» составляет 111 999 455 890 (Сто одиннадцать миллиардов девятьсот девяносто девять миллионов четыреста пятьдесят пять тысяч восемьсот девяносто) белорусских рублей.

**7. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

ОАО «Технобанк» зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 05 августа 1994 года, регистрационный номер № 47. ОАО «Технобанк» создано в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем преобразования ООО СКБ «Технобанк» в ОАО СКБ «Технобанк» с последующим переименованием в ОАО «Технобанк». ОАО «Технобанк» является правопреемником всех прав и обязанностей ООО СКБ «Технобанк», ЗАО «Торгово-Промышленный Банк», ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии**

Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
- в офисе ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00 в рабочие дни;
- на интернет-сайте эмитента: www.tb.by.

**9. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего соответствующее решение**

Решение о тринадцатом выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Технобанк» «01» апреля 2014 года, протокол № 14.

**10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций**

| Номер выпуска | Форма выпуска (вид облигаций) | Объем эмиссии | Количество облигаций | Серия, номера |
|---|---|---|---|---|
| 13 | дисконтные, именные, в бездокументарной форме (в виде записей на счетах), неконвертируемые | 8 000 000 (восемь миллионов) долларов США | 8 000 (восемь тысяч) штук | «ТБ-13», «0001-8000» |

**11. Номинальная стоимость облигаций**

Номинальная стоимость одной облигации тринадцатого выпуска – 1 000 (одна тысяча) долларов США.

**12. Цель выпуска и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**

Облигации выпускаются с целью привлечения свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы банка. Средства, полученные от размещения облигаций, будут направлены на выполнение целей и задач, предусмотренных Уставом ОАО «Технобанк».

**13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 года № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

**14. Сведения о согласовании выпуска облигаций с Национальным банком Республики Беларусь**

Выпуск облигаций осуществляется по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь в пределах 80 процентов нормативного капитала (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от «18» апреля 2014 года № 254).

**15. Период проведения открытой продажи облигаций**

Дата начала открытой продажи (размещения) облигаций: 02 июня 2014 года.

Дата окончания открытой продажи (размещения) облигаций: 31 декабря 2015 года.

**16. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Открытая продажа (размещение) осуществляется:
- на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00 в рабочие дни на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

**17. Срок обращения облигаций**

С 02 июня 2014 года по 01 июня 2018 года (1460 календарных дней). При расчете срока обращения облигаций день начала размещения и день начала погашения облигаций считаются одним днем. Обращение облигаций осуществляется в установленном законодательством Республики Беларусь порядке через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» и (или) на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством. Обращение облигаций тринадцатого выпуска прекращается с даты формирования реестра владельцев облигаций с целью погашения – 30 мая 2018 года.

**18. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения облигаций 01 июня 2018 года.

**19. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты**

